ПРАВОВАЯ ИНИЦИАТИВА

# «Яны зрабілі з майго ўнука кавалак мяса...»

**Палітычныя забойствы і смерці праз віну рэжыму**

Інфармацыйна-аналітычны агляд

## Змест


**Уводзіны і метадалогія** 4

**Права на жыццё. Міжнародныя стандарты** 6

**Прававая кваліфікацыя адказнасці дзяржавы датычна “незаконных смерцяў”** 9

**Права на жыццё і права на ахову здароўя. Нацыянальная база нарматыўна-прававых актаў Рэспублікі Беларусь** 10

**Пазасудовыя смяротныя пакаранні і забойствы палітычных апанентаў рэжыму да 2020 года** 14

**Смерці і забойствы пасля жніўня 2020 года** 16

**Смерці і забойствы ўдзельнікаў пратэстных выступаў** 17

1. Аляксандр Тарайкоўскі 17
2. Андрэй Зельцар 19
3. Генадзь Шутаў 20
4. Дзмітрый Стахоўскі 22
5. Канстанцін Шышмакоў 24
6. Мікіта Крыўцоў 25
7. Раман Бандарэнка 27
8. Уладзімір Крысёнак 29

**Смерці зняволеных у месцах пазбаўлення волі пасля 2020 года** 30

1. Аляксандр Віхор 31
2. Вітольд Ашурак 33
3. Дзмітрый Дудойць 35
4. Алена Амеліна 36
5. Сяргей Шчацінка 36
6. Мікалай Клімовіч 37
7. Алесь Пушкін 38
8. Дзмітрый Сарокін 39

**Высновы** 40

# Скарачэнні ў дакуменце

**СІЗА** — следчы ізалятар

**ІЧУ** — ізалятар часовага ўтрымання

**ЦІП** — цэнтр ізаляцыі правапарушальнікаў

**РУУС** — раённае ўпраўленне ўнутраных спраў

**РАУС** — раённае аддзяленне ўнутраных спраў

**в/ч** — вайсковая частка

**ШІЗА** — штрафны ізалятар

**ПКТ** — памяшканне камернага тыпу

**Аўтазак** — аўтамабіль для перавозкі затрыманых/зняволеных

**АМАП** — атрад міліцыі асаблівага прызначэння

**КК** — Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь

**КПК** — Крымінальна-працэсуальны кодэкс Рэспублікі Беларусь

**КаАП** — Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністратыўных правапарушэннях

**ДВП МУС РБ** — Дэпартамент выканання пакаранняў Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь

**ГАМ** — гарадскі аддзел міліцыі

**СК** — Следчы камітэт Рэспублікі Беларусь

**УСК па г. Мінску** — Упраўленне Следчага камітэта па г. Мінску

**АКР** — аддзяленне крымінальнага розшуку Міністэрства ўнутраных спраў

**ДКСЭ** — Дзяржаўны Камітэт судовых экспертызаў

**КДБ** — Камітэт дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь

**МКС** — Міжнародны крымінальны суд

# Уводзіны і метадалогія

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі пасля выбараў прэзідэнта ў жніўні 2020 года рэзка пагоршылася з прычыны жорсткай рэакцыі рэжыму на пратэстныя настроі грамадзянаў.

Іншадумцаў жорстка збіваюць пры затрыманні, катуюць у месцах утрымання, ствараюць невыносныя бесчалавечныя ўмовы знаходжання ў калоніях і турмах. Як мінімум двух чалавек адкрыта застрэлілі на вуліцах гарадоў і аднаго ва ўласнай кватэры. Палітычныя зняволеныя траплялі пад жорсткі ціск з боку супрацоўнікаў пенітэцыярнай сістэмы, а некаторыя паміраюць у турмах з прычыны ненадання належнай медыцынскай дапамогі.

Палітычныя забойствы і смерці праз віну рэжыму — сістэмная праблема ў Беларусі. Гэта выпадкі падазроных смерцяў грамадзянаў, у якіх мяркуецца адказнасць рэжыму або ў выніку дзеяння, або недагляду/бяздзеяння.

У першую чаргу гэта сітуацыі, калі:

1. смерць магла быць выкліканая дзеяннямі ці бяздзеяннем дзяржавы, яе органаў ці супрацоўнікаў гэтых органаў ці іншым чынам можа быць аднесеная на рахунак дзяржавы ў парушэнне яе абавязку абараняць права на жыццё;
2. смерць настала, калі асоба была затрыманая ці ўтрымлівалася пад вартай дзяржавы, яе органамі ці службовымі асобамі.

Аўтары агляду паспрабавалі сабраць вядомыя выпадкі смерцяў па палітычных матывах і правесці кароткі аналіз гэтай сітуацыі ў Беларусі. Эксперты класіфікуюць у дакуменце 1) смерці падчас пратэстаў 2020 года, звязаныя з пратэстамі, а таксама 2) смерці палітычных зняволеных і затрыманых у месцах пазбаўлення волі (РУУС, РАУС, ІЧУ, турмы і калоніі). Неабходна адзначыць, што прыцягненне да адміністратыўнай, а ў некаторых выпадках і крымінальнай адказнасці людзей за выказванне меркавання, мірныя сходы ці па іншых палітычных матывах з'яўляецца недапушчальным дзеяннем, віна за якое цалкам ляжыць на прадстаўніках рэжыму.

У дадзеным дакуменце названыя 16 імёнаў тых, хто памерлі і загінулі па палітычных матывах з 2020 года па цяперашні час, гісторыі іх смерці, меркаваныя вінаватыя (калі такія ўсталяваныя) і прычыны смерці. Апісанне кожнага кейса завяршаюць высновы пра дастасоўнасць прававых нормаў у кожным канкрэтным выпадку і ролю/удзел рэжыму ў дадзеным інцыдэнце.

У спіс смерцяў не ўключаныя ўсе, хто загінуў за пазначаны перыяд, паколькі з-за адсутнасці крымінальных спраў складана зразумець, што ў рэчаіснасці з'явілася прычынай смерці чалавека. Прадстаўнікі рэжыму ў любым выпадку адмаўляюць, што людзі загінулі ад рук сілавікоў ці праз іх віну. Ні адна крымінальная справа па фактах смерцяў ці гвалту з боку сілавікоў, звязаных з пратэстамі ў Беларусі са жніўня 2020 года, не распачатая, акрамя справы па факце забойства Рамана Бандарэнкі, якая на дадзены момант прыпыненая. У той жа час распачатыя тысячы крымінальных спраў, якія носяць характар палітычнага пераследу, у тым ліку ў сувязі з распаўсюдам інфармацыі пра смерці праз віну рэжыму.

Зыходзячы з прыведзенай вышэй класіфікацыі выпадкаў смерцяў у дадзеным дакуменце, аўтары нагадваюць пра міжнародныя стандарты, згодна з якімі дзяржава абавязаная паважаць і забяспечваць права на жыццё, а таксама надаваць эфектыўныя сродкі прававой абароны і пакрыццё шкоды ўсім ахвярам парушэнняў права на жыццё (гл. раздзел Права на жыццё. Міжнародныя стандарты). Таксама прапаноўваюцца да разгляду стандарты паводзінаў супрацоўнікаў праваахоўных органаў, уключна з ваеннаслужбоўцамі, якім даручаецца выкананне задач па падтрыманні правапарадку. Гэтыя стандарты распрацаваныя перш за ўсё для прадухілення адвольнага пазбаўлення жыцця падчас мірных сходаў пры ўжыванні патэнцыйна смяротнай сілы. Аўтары нагадваюць і пра дакументы, у якіх падкрэсліваецца павышанае абавязанне дзяржавы клапаціцца пра прыняцце любых неабходных мераў для абароны жыцця асобаў, пазбаўленых волі.

У раздзеле Права на жыццё і права на ахову здароўя. Нацыянальная база нарматыўна-прававых актаў Рэспублікі Беларусь надзяляецца ўвага на праваўжывальныя акты, якія рэгулююць дзеянні сілавікоў Міністэрства ўнутраных спраў, Камітэта дзяржаўнай бяспекі і іншых сілавых структур, а таксама асноўныя міжнародныя, агульныя і спецыяльныя абавязанні Рэспублікі Беларусь згодна з унутраным заканадаўствам.

Аўтары агляду не маглі не звярнуцца да выпадкаў смерцяў палітычных апанентаў Аляксандра Лукашэнкі. З 1996 па 2020 год як мінімум дзевяць апанентаў рэжыму былі выкрадзеныя ці памерлі

ненатуральнай смерцю (гл. раздзел Пазасудовыя пакаранні смерцю і забойствы палітычных апанентаў рэжыму).

У раздзеле Смерці і забойствы пасля 2020 года ўтрымліваецца спіс смерцяў, непасрэдна звязаных з пратэстамі (апісаныя восем выпадкаў), а ў раздзеле Смерці зняволеных у месцах пазаўлення волі з 2020 года — інфармацыя пра восем выпадкаў смерцяў з палітычных матываў у месцах затрымання, калоніях і турмах.

Асноўнымі прычынамі апісаных у дакуменце выпадкаў смерцяў праз віну дзяржавы з'яўляюцца дзеянні ці бяздзеянне дзяржавы, што выражаецца ў недастатковай прававой ахове права на жыццё, адвольным ужыванні смяротнай зброі сілавымі структурамі, неналежным ці недастатковым медыцынскім абслугоўванні асобаў у месцах няволі, неналежным назіранні за псіхалагічным станам асобаў, якія ўтрымліваюцца ў месцах няволі, і неправамерным ціску на затрыманых асобаў, што прывяло да суіцыдаў, а таксама неналежным расследаванні выпадкаў пазбаўлення жыцця. Больш падрабязныя высновы і спіс адказных вышэйшых службовых асобаў за гэтыя парушэнні дадзеныя ў раздзеле Высновы.

Дадзены агляд не прэтэндуе на вычарпальны характар зместу і высноваў. Напрыклад, аўтары не аналізавалі смерці, што асвятляліся ў СМІ ў 2020 — 2023 гадах, у якіх не ўбачылі *прамой ці відавочнай сувязі з дзеяннямі рэжыму* (гэта тычыцца, у першую чаргу, фактаў суіцыдаў і смерцяў не па палітычных матывах, а таксама апісаных ананімнымі крыніцамі ці ў дачыненні да ананімных пацярпелых). Не выключана, што пра некаторыя смерці праз віну рэжыму грамадству дагэтуль невядома.

Аўтары агляду пры працы кіраваліся, у першую чаргу, меркаваннямі бяспекі сведкаў, якія далі інфармацыю. Многія з іх непакояцца за перaслед з боку рэжыму. Менавіта таму ў дакуменце не публікуюцца фота пасмяротных дакументаў (пасведчанняў аб смерці, эпікрызаў, выпісак з медыцынскіх картак і іншага). Дадзеныя дакументы маюцца ў распараджэнні Міжнароднага камітэта па расследаванні катаванняў у Беларусі і будуць выкарыстаныя юрыстамі і праваабаронцамі з мэтай прыцягнення да адказнасці вінаватых.

# Права на жыццё. Міжнародныя стандарты

Асноватворным дакументам міжнароднага права, што з'яўляецца глабальным вызначэннем правоў, якімі валодаюць усе людзі, з'яўляецца **Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека** 1948 года, прынятая Генеральнай Асамблеяй ААН. Артыкул 3 Дэкларацыі фармулюе асноўнае права кожнага чалавека — права на жыццё: «*Кожны чалавек мае права на жыццё, на свабоду і на асабістую недатыкальнасць*».

Усе наступныя міжнародныя дакументы ў той ці іншай меры развіваюць і канкрэтызуюць панятак «права на жыццё» і абгрунтоўваюць ролю дзяржавы ў яго абароне.

Так, **Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах** 1966 года (далей — Пакт) канстатуе, што права на жыццё з'яўляецца неад'емным правам кожнага чалавека і гэтае права ахоўваецца законам (артыкул 6). Дадзеная норма служыць асновай для міжнародных стандартаў, якія ўсталёўваюць як негатыўныя, так і пазітыўныя абавязанні дзяржавы па абароне і ахове права на жыццё. Артыкул 6 Пакта закладае аснову для абавязання дзяржаў-удзельніц паважаць і забяспечваць права на жыццё, ператвараць яго ў жыццё з дапамогай заканадаўчых і іншых мераў, а таксама надаваць эфектыўныя сродкі прававой абароны і пакрыццё шкоды ўсім ахвярам парушэнняў права на жыццё[1]. У **Заўвазе агульнага парадку №36[2]** (Заўвага №36) Камітэт па правах чалавека ААН указвае, што права на жыццё — гэта права, якое не варта тлумачыць вузка, гэта права людзей быць вольнымі ад дзеянняў і бяздзеяння, якія прызначаныя ці могуць стаць прычынай іх ненатуральнай ці заўчаснай смерці, а таксама на годнае жыццё (пункт 3).

У артыкуле 17 Пакта гаворыцца, што ніхто не можа трапляць пад адвольнае ці незаконнае ўмяшанне ў яго асабістае і сямейнае жыццё, адвольны ці незаконны замах на недатыкальнасць яго жылля ці таямніцу яго карэспандэнцыі ці незаконны замах на яго гонар і рэпутацыю. Кожны чалавек мае права на абарону закона ад такога ўмяшання ці такіх замахаў.

Заўвага №36 піша, што *ужыванне патэнцыйна смяротнай сілы ў праваахоўных мэтах з'яўляецца крайняй мерай*, да якой варта звяртацца толькі ў выпадку строгай неабходнасці для абароны жыцця ад немінучай пагрозы смерці ці сур'ёзнага паранення. Наўмыснае пазбаўленне жыцця любымі сродкамі дапускаецца толькі ў тым выпадку, калі гэта абсалютна неабходна для абароны жыцця ад немінучай пагрозы (пункт 12). Дзяржавы-ўдзельніцы павінны прыняць усе неабходныя меры для прадухілення адвольнага пазбаўлення жыцця з боку супрацоўнікаў праваахоўных органаў, уключна з ваеннаслужбоўцамі, якім даручаецца выкананне задачаў па падтрыманні правапарадку. Гэтыя меры ўключаюць прыняцце адпаведнага заканадаўства па кантролі за ўжываннем смяротнай сілы супрацоўнікамі праваахоўных органаў, працэдураў, скіраваных на забеспячэнне належнага планавання дзеянняў праваахоўных органаў у адпаведнасці з неабходнасцю мінімізацыі рызыкаў для жыцця людзей, абавязковае інфармаванне, разгляд і расследаванне ў сувязі з інцыдэнтамі са смяротным вынікам і іншымі інцыдэнтамі, якія пагражаюць жыццю, а таксама наданне сілам, адказным за барацьбу з масавымі беспарадкамі, эфектыўных, менш небяспечных сродкаў і належных сродкаў абароны, з тым каб ухіліць неабходнасць ужывання імі смяротнай сілы. Усе аперацыі супрацоўнікаў праваахоўных органаў варта праводзіць з выкананнем адпаведных міжнародных стандартаў, уключна з **Кодэксам паводзінаў службовых асобаў па падтрыманні правапарадку** і **Асноўнымі прынцыпамі ўжывання сілы і агнявой зброі службовымі асобамі па падтрыманні правапарадку**, і супрацоўнікі праваахоўных органаў павінны праходзіць належную падрыхтоўку, скіраваную на ўкараненне гэтых стандартаў, з тым каб пры любых абставінах забяспечыць выкананне права на жыццё ў самым поўным аб'ёме (пункт 13).

Падчас правядзення масавых сходаў, згодна з Заўвагай агульнага парадку №37, роля супрацоўнікаў праваахоўных органаў пры неабходнасці іх прысутнасці для аховы грамадскага парадку пры правядзенні сходу зводзіцца да забеспячэння магчымасці правядзення сходу ў прадугледжаным парадку і звядзення да мінімуму магчымасці прычынення шкоды якой-небудзь асобе і шкоды маёмасці (пункт 76).

Агнявая зброя не з'яўляецца належным сродкам аховы грамадскага парадку пры правядзенні сходаў[3]. З тым, каб ужыванне агнявой зброі супрацоўнікамі праваахоўных органаў у кантэксце сходаў адпавядала нормам міжнароднага права, усе падобныя выпадкі павінны абмяжоўвацца ўжываннем да канкрэтных асобаў пры абставінах, у якіх гэта строга неабходна для супрацьдзеяння

1 https://www.un.org/ru/documents/decl_conv/conventions/pactpol.shtml, Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах, 16/12/1966

2 https://documents-dds-ny.un.org/doc/UNDOC/GEN/G19/261/17/PDF/G1926117.pdf?OpenElement, Заўвагі агульнага парадку №36, CCPR /C/GC/36

3 African Commission on Human and Peoples' Rights, Guidelines on Policing Assemblies in Africa, para. 21.2.4., CCPR/C/GC/37, п.88

немінучай пагрозе смерці ці цяжкіх пакалечанняў[4]. Улічваючы пагрозу, якую такая зброя нясе для жыцця, гэты мінімальны парог варта таксама ўжываць да стральбы гумавымі кулямі з металічным сардэчнікам[5]. У выпадку калі супрацоўнікі праваахоўных органаў рыхтуюцца да ўжывання сілы ці калі гвалтоўныя дзеянні падаюцца верагоднымі, органы ўлады павінны забяспечыць таксама наяўнасць адпаведных медыцынскіх аб'ектаў.

Дзяржавы абавязаныя эфектыўна, непрадузята і своечасова расследаваць любыя сцвярджэнні ці абгрунтаваныя падазрэнні ў дачыненні да супрацьпраўнага ўжывання сілы ці іншых парушэнняў супрацоўнікамі праваахоўных органаў, уключна з сексуальным ці гендарным гвалтам, у кантэксце сходаў[6].

У адпаведнасці з міжнародным правам дзяржава нясе адказнасць за дзеянні і бяздзеянне сваіх праваахоўных органаў[7].

Камітэт па правах чалавека ў Заўвазе № 36 (пункт 25) асабліва падкрэслівае, што дзяржава нясе павышанае абавязанне клапаціцца пра прыняцце любых неабходных мераў для абароны жыцця *асобаў, пазбаўленых волі дзяржавай,* паколькі, паддаючы асобаў арышту, затрыманню, зняволенню ці іншым чынам пазбаўляючы іх волі, дзяржавы-ўдзельніцы бяруць на сябе адказнасць за клопат пра іх жыццё і фізічную недатыкальнасць, пры гэтым для змяншэння такой адказнасці яны не могуць спасылацца на адсутнасць фінансавых рэсурсаў ці іншыя матэрыяльна-тэхнічныя праблемы.

Абавязак па абароне жыцця ўсіх затрыманых асобаў уключае ў сябе:

- наданне ім неабходнай медыцынскай дапамогі
- адпаведны рэгулярны кантроль за іх здароўем
- абарону ад гвалту з боку іншых зняволеных
- прадухіленне самагубстваў
- наданне разумных прыстасаванняў інвалідам.

Таксама неабходна адзначыць такі дакумент як **Мінімальныя стандартныя правілы абыходжання са зняволенымі**[8] (далей — Правілы). У ім напісаныя мінімальныя стандарты, якія павінны вытрымліваць пенітэцыярныя ўстановы ў забеспячэнні зняволеных (у тым ліку асобаў, якія ўтрымліваюцца пад вартай) медыцынскай дапамогай (наяўнасць кваліфікаваных медыцынскіх супрацоўнікаў, магчымасць тэрміновага лекавання асуджаных у грамадзянскіх бальніцах, забеспячэнне адмысловым абсталяваннем і лекамі, дзеянні кіраўніка ўстановы для забеспячэння лекавага працэсу зняволеных) (пункты 22–26 Правілаў).

**Збор прынцыпаў абароны ўсіх асобаў, якія трапілі пад затрыманне ці зняволенне ў якой бы там ні было форме**[9] ўсталёўвае магчымасць для затрыманай асобы ці той, якая ў зняволенні, прайсці належнае медыцынскае абследаванне ў магчымыя кароткія тэрміны пасля яе прыбыцця ў месца затрымання ці зняволення; бясплатнае медыцынскае абслугоўванне і лекаванне кожны раз, калі ў гэтым з'яўляецца неабходнасць (Прынцып 24).

**Асноўныя прынцыпы абыходжання са зняволенымі**[10] пацвярджаюць неабходнасць доступу зняволеных да медыцынскіх паслуг, якія ёсць у краіне, без дыскрымінацыі па прыкмеце іх прававога становішча.

**Правілы Нельсана Мандэлы**[11] па сутнасці паўтараюць стандарты, замацаваныя ў Мінімальных стандартных правілах абыходжання са зняволенымі.

Акрамя таго, стандарт для надання медыцынскай дапамогі зняволеным утрымліваецца ў **Прынцыпах медыцынскай этыкі**[12], што тычацца ролі супрацоўнікаў аховы здароўя, асабліва

4 CCPR /C/GC/36, п. 12; і Асноўныя прынцыпы ўжывання сілы і агнявой зброі службовымі асобамі па падтрыманні правапарадку, прынцыпы 9 і 14
5 Дапаможнік Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па выкананні правоў чалавека пры ўжыванні менш смяротнай зброі ў праваахоўнай дзейнасці, п. 7.5.8
6 CCPR/C/KOR/CO/4, пп. 43–44; і CCPR/C/BHR/CO/1, п. 36
7 CCPR/C/GC/37, п.89
8 Прынятыя Кангрэсам Арганізацыі Аб'яднаных Нацый па папярэджанні злачынства і абыходжанні з правапарушальнікамі ў 1955 годзе.
9 Прыняты ААН у 1988 годзе.
10 Прынятыя ААН у 1990 годзе.
11 Прынятыя Генеральнай Асамблеяй ААН у 2015 годзе.
12 Прынятыя ААН у 1982 годзе.

лекараў, у ахове зняволеных ці затрыманых асобаў ад катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных відаў абыходжання і пакарання, якія прыніжаюць годнасць. Прынцып 1 усталёўвае, што супрацоўнікі аховы здароўя, асабліва лекары, якія забяспечваюць медыцынскае абслугоўванне зняволеных ці затрыманых асобаў, абавязаныя ахоўваць іх фізічнае і псіхічнае здароўе і забяспечваць лекаванне хваробаў з такой жа якасцю і на такім узроўні, які забяспечваецца асобам, якія не з'яўляюцца зняволенымі ці затрыманымі. Таксама дадзены дакумент усталёўвае выпадкі, калі паводзіны медыцынскіх супрацоўнікаў у дачыненні да зняволеных ці затрыманых з'яўляецца безумоўным парушэннем этыкі.

**Мінесоцкі пратакол аб расследаванні патэнцыйна незаконнай смерці** (2016) утрымлівае асноўныя прынцыпы правядзення расследаванняў патэнцыйна незаконных смерцяў, здзейсненых прыватнымі асобамі, нават калі дзяржава не можа несці адказнасць за няздольнасць прадухіліць такія смерці[13].

**Канвенцыя для абароны ўсіх асобаў ад гвалтоўных знікненняў**[14] з'яўляецца першай універсальнай дамовай з юрыдычным абавязкам у галіне правоў чалавека, што тычацца гвалтоўных знікненняў. Яна прадугледжвае, што гвалтоўныя знікненні ўяўляюць сабой злачынствы супраць чалавечнасці, абавязвае краіны-ўдзельніцы ўводзіць крымінальную адказнасць за гвалтоўныя знікненні і рабіць іх злачынствам, якое караецца, а таксама абавязвае дзяржаву шукаць асобаў, якія прапалі без весткі, расследаваць іх знікненне і забяспечваць доступ пацярпелых да правасуддзя і пакрыццё шкоды15.

13 https://www.ohchr.org/ru/special-procedures/sr-executions/minnesota-protocol
14 Рэспублікай Беларусь гэтая Канвенцыя не ратыфікаваная.
15 https://www.ohchr.org/ru/treaty-bodies/ced/background-international-convention-protection-all-persons-enforced-disappearance

# Прававая кваліфікацыя адказнасці дзяржавы датычна «незаконных смерцяў»

Зыходзячы з прыроды абавязанняў дзяржавы па выкананні правоў чалавека, яны дзеляцца на *негатыўныя і пазітыўныя*.

*Негатыўным абавязаннем* называецца абавязак дзяржаўных органаў (службовых асобаў і агентаў, дзеянні якіх можна аднесці да дзеянняў дзяржавы) устрымацца ад дзеянняў, якія парушаюць ці абмяжоўваюць правы і свабоды чалавека.

*Пазітыўнае абавязанне* — гэта абавязак адпаведных дзяржаўных органаў (службовых асобаў) здзейсніць пэўныя актыўныя дзеянні па абароне права ад замаху з боку прыватных асобаў ці іншых дзяржаўных органаў (службовых асобаў), якое належыць кожнай асобе.

Міжнароднае права аднолькава лічыць парушэннем абавязанняў дзяржавы ў сферы правоў чалавека невыкананне як негатыўных, так і пазітыўных абавязанняў.

Пазітыўныя абавязанні прымушаюць дзяржавы рабіць пазітыўныя крокі для аховы жыцця людзей у межах сваёй юрысдыкцыі (прымаць заканадаўства аб абароне ад адвольнага пазбаўлення жыцця і забяспечваць яго эфектыўную рэалізацыю). Працэдурныя абавязанні, якія могуць быць залічаныя да пазітыўных, мяркуюць правядзенне эфектыўнага афіцыйнага расследавання выпадкаў смерці.

Негатыўныя абавязанні патрабуюць ад дзяржавы ўстрымання ад незаконнага пазбаўлення жыцця.

Права на жыццё ў месцах зняволення (то бок асобаў, якія знаходзяцца пад апекай і кантролем дзяржавы) прадугледжвае пазітыўныя абавязанні па стварэнні ўмоваў недапушчэння адвольнага пазбаўлення жыцця зняволеных праз навучанне супрацоўнікаў турмаў правам чалавека, забеспячэнні медыцынскай дапамогай, правядзенні расследаванняў у выпадку смерці і прыняцці іншых мераў, неабходных для захавання жыцця асобаў, якія знаходзяцца пад вартай.

Такім чынам, дзяржаўныя ўлады павінны рабіць адпаведныя меры для прыцягнення да адказнасці тых, хто здзейсніў незаконнае пазбаўленне жыцця. Для гэтага дзяржава павінна даць не толькі магчымасць свабоднай падачы скарг і доступу да працэдуры расследавання, але таксама і эфектыўную сістэму крымінальнага права.

# Права на жыццё і права на ахову здароўя. Нацыянальная база нарматыўна-прававых актаў Рэспублікі Беларусь

Акрэслім асноўныя прававыя нормы Рэспублікі Беларусь, якія ўсталёўваюць абавязкі па ахове і (ці) абароне права на жыццё і адказнасць за парушэнне гэтага права як неад'емнага права кожнага чалавека.

Заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб праве на жыццё і здароўе можна ўмоўна раздзяліць на 2 блокі: 1) міжнародныя абавязанні згодна з унутраным заканадаўствам і 2) агульныя і спецыяльныя абавязанні згодна з унутраным заканадаўствам.

*Міжнародныя абавязанні згодна з унутраным заканадаўствам*

Беларусь з'яўляецца ўдзельніцай ААН і Статута Міжнароднага Суда ААН, таму палажэнні Статута Міжнароднага Суда ААН для яе абавязковыя (артыкул 93 Статута ААН).

Згодна з артыкулам 8 **Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь** (далей — Канстытуцыя) Рэспубліка Беларусь прызнае прыярытэт агульнапрызнаных прынцыпаў міжнароднага права і забяспечвае адпаведнасць ім заканадаўства. Рэспубліка Беларусь у адпаведнасці з нормамі міжнароднага права можа на добраахвотнай аснове ўваходзіць у міждзяржаўныя ўтварэнні і выходзіць з іх. Не дапускаецца заключэнне міжнародных дамоваў, якія супярэчаць Канстытуцыі. Такім чынам, Рэспубліка Беларусь абавязаная выконваць прынятыя на сябе абавязанні па міжнародных дамовах.

У прыватнасці, частка 3 артыкула 21 Канстытуцыі ўсталёўвае, што дзяржава гарантуе правы і свабоды грамадзянаў Беларусі, замацаваныя ў Канстытуцыі, законах і прадугледжаныя міжнароднымі абавязаннямі дзяржавы.

Згодна з артыкулам 36 **Закона Рэспублікі Беларусь ад 23 ліпеня 2008 г. №421-З «Аб міжнародных дамовах Рэспублікі Беларусь»**, міжнародныя дамовы Рэспублікі Беларусь належаць сумленнаму выкананню Рэспублікай Беларусь у адпаведнасці з міжнародным правам.

У адносінах да міжнародных дамоваў, ратыфікаваных Рэспублікай Беларусь, у дачыненні да права на жыццё і здароўе зняволеных важнае значэнне маюць:

- Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах
- Міжнародны пакт аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах
- Канвенцыя супраць катаванняў
- Канвенцыя супраць дыскрымінацыі
- Факультатыўны пратакол да Канвенцыі супраць дыскрымінацыі
- Камітэт па ліквідацыі дыскрымінацыі ў дачыненні да жанчынаў.

Неабходна адзначыць, што Законам Рэспублікі Беларусь ад 27.10.2022 №217-З Рэспублікай Беларусь быў дэнансаваны Факультатыўны пратакол да Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах.

*Агульныя і спецыяльныя абавязанні згодна з унутраным заканадаўствам*

Права на жыццё замацаванае артыкулам 24 **Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь:** *Кожны мае права на жыццё. Дзяржава абараняе жыццё чалавека ад любых супрацьпраўных замахаў.*

Артыкул 25 Канстытуцыі ўсталёўвае, што дзяржава забяспечвае свабоду, недатыкальнасць і годнасць асобы. Абмежаванне ці пазбаўленне асабістай свабоды магчымае ў выпадках і парадку, усталяваных законам. Асоба, зняволеная пад варту, мае права на судовую праверку законнасці яе затрымання ці арышту. Ніхто не павінен трапляць пад катаванні, жорсткае, бесчалавечнае або прыніжальнае абыходжанне ці пакаранне, а таксама не павінен без згоды падпадаць пад медыцынскія ці іншыя доследы.

Артыкул 45 Канстытуцыі гарантуе грамадзянам Рэспублікі Беларусь права на ахову здароўя, уключна з бясплатным лекаваннем за кошт дзяржаўных сродкаў у парадку, усталяваным законам.

Дзяржава стварае ўмовы даступнага для ўсіх грамадзянаў медыцынскага абслугоўвання.

Зыходзячы з тэмы даследавання, аўтары лічаць неабходным звярнуць увагу на некаторыя праваўжывальныя акты, якія рэгулююць дзеянні супрацоўнікаў Міністэрства ўнутраных спраў, Камітэта дзяржаўнай бяспекі і іншых сілавых структур.

Так, **Закон Рэспублікі Беларусь ад 10.07.2012 №390-З «Аб органах дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь»** прадугледжвае, што ўжыванне фізічнай сілы, спецыяльных сродкаў, баявой і спецыяльнай тэхнікі, зброі павінна папярэднічаць выразна выказанае і відавочнае для асобы, супраць якой яны могуць быць ужытыя, папярэджанне пра намер іх ужыць з наданнем дастатковага часу для выканання законных патрабаванняў, за выключэннем выпадкаў, калі прамаруджанне ў іх ужыванні створыць непасрэдную небяспеку для жыцця супрацоўніка органаў дзяржаўнай бяспекі ці іншых грамадзянаў або можа пацягнуць іншыя цяжкія наступствы (частка 2 артыкула 10).

Ва ўсіх выпадках ужывання фізічнай сілы, спецыяльных сродкаў, баявой і спецыяльнай тэхнікі, ужывання і выкарыстання зброі супрацоўнік органаў дзяржаўнай бяспекі павінен дзейнічаць, імкнучыся нанесці найменшую шкоду жыццю, здароўю, гонару і годнасці грамадзянаў, маёмасці грамадзянаў і арганізацый, дзяржаўнай маёмасці, а таксама абавязаны прыняць меры па неадкладным наданні пацярпелым медыцынскай і іншай неабходнай дапамогі (частка 3 артыкула 10).

Акрамя таго, **Законам Рэспублікі Беларусь ад 17.07.2007 №263-З «Аб органах унутраных спраў Рэспублікі Беларусь»** прадугледжаны вычарпальны пералік выпадкаў, у якіх праваахоўныя органы маюць права ўжываць баявую і спецыяльную тэхніку, у выпадку:

- абароны грамадзянаў ад нападу, які пагражае іх жыццю ці здароўю, калі спыніць гэты напад іншым спосабам не выдаецца магчымым;
- вызвалення закладнікаў;
- адбіцця групавога ці ўзброенага нападу, у тым ліку з ужываннем транспартных сродкаў, на падахоўныя аб'екты, населеныя пункты, будынкі, памяшканні, збудаванні і (ці) транспартныя сродкі незалежна ад іх прыналежнасці або для вызвалення захопленых аб'ектаў;
- спынення супраціву ўзброеных асобаў, якія адмаўляюцца выканаць законныя патрабаванні супрацоўніка органаў унутраных спраў аб спыненні супрацьпраўных дзеянняў і здачы зброі, боепрыпасаў да яе, выбуховых рэчываў, выбуховых прыладаў і баявой тэхнікі, якія маюцца ў гэтых асобаў;
- спынення масавых беспарадкаў (абзац уведзены Законам Рэспублікі Беларусь ад 17.05.2021 №106-З);
- забеспячэння рэжымаў надзвычайнага становішча і ваеннага становішча;
- у іншых выпадках, якія вызначаюцца прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

Паказальным тут з'яўляецца тое, што прэзідэнт Рэспублікі Беларусь мае права вызначыць любыя выпадкі для ўжывання такой тэхнікі. Заканадаўства не прадугледжвае ніякіх абмежаванняў або крытэраў для прыняцця прэзідэнтам такога рашэння. Звяртае на сябе ўвагу той факт, што толькі ў 2021 годзе, то бок пасля масавых акцый пратэсту 2020 года, падчас якіх мірныя грамадзяне жорстка разганяліся з выкарыстаннем спецыяльных і баявых сродкаў, у вышэйнапісаны пералік былі ўнесеныя выпадкі спынення масавых беспарадкаў.

Прававое рэгуляванне абароны права на жыццё ў дачыненні да такой уразлівай групы як *затрыманыя асобы ці асобы, якія знаходзяцца ў месцах нявол*і, у Рэспубліцы Беларусь зафіксаванае шэрагам нарматыўна-прававых актаў, асноўныя з іх разгледжаныя далей.

**Крымінальна-выканаўчы Кодэкс Рэспублікі Беларусь** утрымлівае асноўныя гарантыі для асобаў у месцах нявол, скіраваныя на ахову і абарону жыцця, і практыка яго ўжывання павінна засноўвацца на строгім выкананні гарантый абароны ад катаванняў, гвалту і іншага жорсткага ці прыніжальнага для чалавечай годнасці абыходжання з асуджанымі.

Згодна з Кодэксам, асуджаныя маюць *права на ахову здароўя*. Медыцынская дапамога асуджаным можа надавацца ў амбулаторных, стацыянарных умовах, ва ўмовах аддзялення дзённага перабывання, а таксама па-за арганізацыяй аховы здароўя ў парадку, усталяваным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Нягледзячы на тое, што заканадаўства на сённяшні дзень прадугледжвае магчымасць змянення меры стрымання ў выглядзе зняволення пад варту на больш мяккую, а таксама вызваленне ад пакарання, у тым ліку ў выглядзе пазбаўлення волі, у дачыненні адпаведна да падазраваных, абвінавачаных і асуджаных, *у якіх дыягнаставанае цяжкае захворванне,* дзейныя нормы закона і існыя працэдуры далёкія ад ідэалу і ў поўнай ступені не забяспечваюць захаванне жыцця пазначаным асобам.

Нарматыўнай базай для змянення меры стрымання ў выглядзе зняволення пад варту на больш мяккую ў дачыненні да падазраваных і абвінавачаных, якія пакутуюць на цяжкія захворванні, з'яўляецца **артыкул 92 Крымінальна-працэсуальнага Кодэкса Рэспублікі Беларусь і Пастанова Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь і Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь ад 16 лютага 2011 г. № 54/15 «Аб зацвярджэнні Інструкцыі пра парадак медыцынскага агляду асуджаных і ўсталяванне пераліку захворванняў, якія перашкаджаюць далейшаму адбыццю пакарання»,** якім зацверджаны **Пералік захворванняў, што перашкаджаюць далейшаму адбыццю пакарання**.

Паколькі цяжкія захворванні звязаныя з небяспекай для жыцця чалавека і патрабуюць пастаяннага догляду за пацыентам і яго асаблівага лекавання, знаходжанне цяжкахворых ва ўмовах строгай ізаляцыі можа прывесці (і, на жаль, нярэдка прыводзіць) да смерці хворага. Прычынамі гэтага з'яўляюцца як менш камфортныя ўмовы ўтрымання ў няволі, так і складанасці, а часта і немагчымасць:

- прыцягнення да лекавання вузкаспецыяльных лекараў,
- выкарыстання спецыяльнага медыцынскага абсталявання,
- забеспячэння хворага дарагімі лекамі,

што для абвінавачанага і асуджанага можа быць раўназначна *катаванням*.

**Правілы ўнутранага распарадку папраўчых установаў**[16] усталёўваюць парадак адбыцця пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі, канкрэтызуюць пытанні дзейнасці папраўчых установаў, у тым ліку парадак надання медыцынскай дапамогі асуджаным. Для надання экстранай і спецыялізаванай медыцынскай дапамогі, пры адсутнасці такой у лекава-прафілактычных установах месцаў пазбаўлення волі, асуджаныя ва ўсталяваным парадку накіроўваюцца ў дзяржаўныя арганізацыі аховы здароўя з забеспячэннем іх аховы.

**Законам Рэспублікі Беларусь ад 18 чэрвеня 1993 г. № 2435-XII «Аб ахове здароўя»** ўсталявана, што асобам, якія знаходзяцца пад следствам, адбываюць пакаранне ў выглядзе арышту, абмежавання волі, пазбаўлення волі, пажыццёвага зняволення, а таксама асуджаным да смяротнага пакарання, гарантуецца наданне неабходнай медыцынскай дапамогі. Пры паступленні ва ўстановы крымінальна-выканаўчай сістэмы Міністэрства ўнутраных спраў кожны асуджаны падлягае абавязковаму медыцынскаму агляду (частка 12 артыкула 14).

**Законам Рэспублікі Беларусь ад 16 чэрвеня 2003 г. № 215-З «Аб парадку і ўмовах утрымання асобаў пад вартай»** прадугледжана, што ўтрыманне асобаў пад вартай ажыццяўляецца на прынцыпах законнасці, гуманізму, роўнасці ўсіх грамадзянаў перад законам, павагі чалавечай годнасці і не павінна суправаджацца жорсткім, негуманным абыходжаннем, якое можа нанесці шкоду фізічнаму ці псіхалагічнаму здароўю асобы, якая ўтрымліваецца пад вартай (артыкул 2).

У законе падкрэсліваецца (частка 1 артыкул 8), што асобы, якія ўтрымліваюцца пад вартай, у выпадку неабходнасці надання ім медыцынскай дапамогі памяшчаюцца ў дзяржаўныя арганізацыі аховы здароўя.

**Правілы ўнутранага распарадку следчых ізалятараў крымінальна-выканаўчай сістэмы Міністэрства ўнутраных спраў[17]** вызначаюць парадак надання медыцынскай дапамогі і выдачы лекавых сродкаў асобам, якія ўтрымліваюцца пад вартай (пункты 172, 173).

**Інструкцыя па медыцынскім забеспячэнні асобаў, якія ўтрымліваюцца ва ўстановах крымінальна-выканаўчай сістэмы Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь**[18] вызначае парадак арганізацыі медыцынскай дапамогі спецкантынгенту і комплексу санітарна-

16 Правілы ўнутранага распарадку папраўчых установаў, зацв. Пастановай Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь ад 20.10.2000 №174.

17 Правілы ўнутранага распарадку следчых ізалятараў крымінальна-выканаўчай сістэмы Міністэрства ўнутраных спраў, зацв. Пастановай Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь ад 13.01.2004 №3

18 Пастанова Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь і Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь ад 27.08.2003 N 202/39 «Аб зацвярджэнні Інструкцыі па медыцынскім забеспячэнні асобаў, якія ўтрымліваюцца ва ўстановах крымінальна-выканаўчай сістэмы Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь»

супрацьэпідэмічных, лекава-дыягнастычных, рэабілітацыйных, аздараўленчых і іншых мерапрыемстваў у мэтах надання даступнай медыцынскай дапамогі, захавання і ўмацавання здароўя спецкантынгенту (пункты 4, 5).

Пры адсутнасці магчымасці надання ва ўстановах крымінальна-выканаўчай сістэмы неадкладнай і планавай медыцынскай дапамогі (у першую чаргу спецыялізаванай — анкалагічнай, кардыялагічнай, фтызіятрычнай і іншай) неабходныя лекава-дыягнастычныя мерапрыемствы праводзяцца адпаведнымі арганізацыямі аховы здароўя. Медыцынская дапамога, у тым ліку забеспячэнне медыкаментамі па прызначэннях лекара, надаецца спецкантынгенту бясплатна.

Цяперашнія ўмовы для асуджаных, асабліва па палітычных матывах, хутчэй носяць карны характар, часам гэта мяжуе з узроўнем катаванняў. Аднак **частка 7 артыкула 3 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь** усталёўвае, што пакаранне і іншыя меры крымінальнай адказнасці не маюць за сваю мэту чыненне фізічных пакутаў ці прыніжэнне чалавечай годнасці.[19]

**Артыкул 145 КК** прадугледжвае адказнасць за давядзенне да самагубства да пяці гадоў, калі яно здзейсненае асобай, ад якой пацярпелы залежаў тым ці іншым чынам.

Неналежнае выкананне прафесійных абавязкаў, якое пацягнула па неасцярожнасці смерць пацыента, прадугледжанае **часткай 2 артыкула 162 КК** і тычыцца ў дадзеным кантэксце медыцынскіх супрацоўнікаў папраўчых установаў.

**Артыкул 128 КК** прадугледжвае крымінальную адказнасць за дзеянні, якія трапляюць пад класіфікацыю злачынстваў супраць бяспекі чалавецтва. Сярод іх — незаконнае ўтрыманне ў зняволенні, масавае ці сістэматычнае ажыццяўленне смяротных пакаранняў без суда, выкраданне людзей, за якім ідзе іх знікненне, катаванні ці акты жорсткасці, якія здзяйсняюцца ў сувязі з расавай, нацыянальнай, этнічнай прыналежнасцю, палітычнымі поглядамі і веравызнаннем грамадзянскага насельніцтва.

Згодна з артыкулам 85 КК, правілы пра заканчэнне тэрмінаў даўніны для прыцягнення да крымінальнай адказнасці асобаў, якія здзейснілі крымінальнае злачынства, прадугледжанае артыкулам 128 КК, не прымяняюцца.

---

19 Кодэкс Рэспублікі Беларусь ад 09.07.1999 N 275-З «Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь»

# Пазасудовыя смяротныя пакаранні і забойствы палітычных апанентаў рэжыму да 2020 года

Гісторыя прэзідэнцтва Аляксандра Лукашэнкі напоўненая фактамі гвалтоўных смерцяў і знікненняў апанентаў уладаў і іншадумцаў. Пачынаючы з 1996 года па 2020 год як мінімум дзевяць апанентаў рэжыму былі выкрадзеныя ці памерлі ненатуральнай смерцю.

**12 лістапада 1996 года** рана зранку па дарозе з канферэнцыі ў аўтамабільную аварыю трапіў журналіст і вядомы беларускі палітолаг, прэзідэнт Нацыянальнага цэнтра стратэгічных ініцыятыў «Усход — Захад» **Анатоль Майсеня**. У выніку лабавога сутыкнення з грузавым аўтамабілем ён атрымаў цяжкія траўмы і памёр па дарозе ў бальніцу.

Па афіцыйнай версіі, Майсеня заснуў, «не справіўся з кіраваннем» аўтамабіля і стаў вінаватым у аварыі. Па неафіцыйнай версіі, смерць была не выпадковай: аварыя магла быць арганізаваная. Як забойства назваў смерць Майсені былы міністр унутраных спраў Юры Захаранка, які прыбыў на месца здарэння адразу пасля аварыі. Крымінальная справа па факце смерці Анатоля Майсені распачатая не была.

У той жа год прама ў цэнтры Мінска была абстраляная машына, у якой ехаў **Генадзь Карпенка**[20], віцэ-спікер Вярхоўнага Савета, мэр горада Маладзечна. Гэта здарылася адразу пасля таго, як стала вядома, што Карпенка павінен узначаліць ценявы ўрад. Крымінальная справа была распачатая, але пасля яе закрылі.

Праз тры гады, **6 красавіка 1999 года**, Генадзь Карпенка нечакана памірае. Усе, хто бачыў яго ў апошні дзень перад здарэннем, сцвярджалі, што ён быў ажыўлены, здаровы, жыццярадасны, прыкметаў недамагання ў яго не было. Хаця, па заключэнні медыкаў, у яго быў прыступ гіпертаніі, артэрыяльны ціск перавышаў паказчык 200. Незадоўга да гэтага Генадзь Дзмітрыевіч распавядаў, што яго спрабавалі атруціць. Крымінальную справу па версіі «атручванне» не распачыналі. Пасля смерці палітыка нават не праводзілася судмедэкспертыза цела.

**24 красавіка 1999 года** ў аўтакатастрофе загінуў старшыня прафсаюза «Садружнасць» **Арнольд Пячэрскі.** У гэты час ён займаўся арганізацыяй усебеларускай акцыі пратэсту, прызначанай на 1 траўня. Ён быў даверанай асобай кандыдата ў прэзідэнты Міхаіла Чыгіра і прымаў актыўны ўдзел у падрыхтоўцы выбараў прэзідэнта, прызначаных на 16 траўня. Паводле медыцынскага заключэння, смерць надышла ў выніку пералома скляпення чэрапа і ўдару галаўнога мозга. Кіроўца ў аварыі не пацярпеў. Паводле яго версіі, падчас руху ён і пасажыр заснулі, і машына ўрэзалася ў «ЗІЛ», які стаяў на дарозе менавіта тым бокам, дзе сядзеў Арнольд. За некалькі месяцаў да таго, як загінуў, Пячэрскі казаў, што за ім сочаць. Крымінальную справу па факце смерці Арнольда Пячэрскага не распачалі.

**7 траўня 1999 года** па дарозе дадому быў выкрадзены экс-міністр унутраных спраў генерал **Юрый Захаранка**. Захаранка таксама сцвярджаў, што за ім пастаянна сачылі. Крымінальную справу пра выкраданне экс-міністра распачалі толькі 16 верасня, пасля знікнення Віктара Ганчара і Анатоля Красоўскага.

**16 верасня 1999 года**, за тры дні да апублікавання дакумента аб адхіленні ад улады Лукашэнкі за сур'ёзныя парушэнні Канстытуцыі, у цэнтры горада былі выкрадзеныя віцэ-спікер Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь **Віктар Ганчар** і яго сябар бізнесовец **Анатоль Красоўскі**.

**7 ліпеня 2000 года** аператар беларускага карпункта ГРТ **Дзмітрый Завадскі** прапаў па дарозе ў аэрапорт Мінск-2, куды ехаў сустракаць свайго сябра і калегу Паўла Шарамета. Павел знайшоў на стаянцы аэрапорта пустую машыну. З таго часу пра лёс Дзмітрыя нічога не вядома. Крымінальную справу распачалі, праз два гады суд вынес абвінаваўчы прысуд у дачыненні да групы Валерыя Ігнатовіча, прызнанай вінаватай у здзяйсненні шэрагу цяжкіх злачынстваў, уключна з выкраданнем Дзмітрыя Завадскага. Цела Дзмітрыя знойдзена не было.

У **снежні 2001 года** скончыў жыццё самагубствам актывіст моладзевага апазіцыйнага руху «Зубр» з Гомеля **Андрэй Зайцаў**. Супрацоўнік КДБ шантажаваў яго пагрозай турэмнага зняволення. Крымінальную справу па факце смерці не распачалі.

20 Генадзь Карпенка, доктар тэхнічных навук, члец-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі, акадэмік трох галіновых і міжнародных акадэмій, лаўрэат Дзяржпрэміі, аўтар 50 вынаходніцтваў. У той час быў першым і адзіным рэальным кандыдатам апазіцыі на прэзідэнцкіх выбарах.

**3 верасня 2010 года**, напярэдадні чарговых прэзідэнцкіх выбараў, на лецішчы быў знойдзены павешаным **Алег Бябенін**, апазіцыйны журналіст, заснавальнік рэсурсу «Хартыя›97», кіраўнік выбарчай кампаніі кандыдата ў прэзідэнты Андрэя Саннікава. Па меркаванні калег, сяброў, родзічаў і журналістаў, у Алега не было прычынаў скончыць жыццё, ён павесіўся не без чыёйсьці дапамогі.[21]

Па фактах знікненняў палітычных апанентаў рэжыму ў 1999–2000 гадах экс-міністра ўнутраных спраў Юрыя Захаранкі, былога віцэ-спікера Вярхоўнага Савета Віктара Ганчара, бізнесоўца Анатоля Красоўскага, журналіста Дзмітрыя Завадскага за 24 гады з боку дзяржаўных структураў не было распачата ніякіх спробаў да эфектыўнага расследавання гэтых спраў. І гэта нягледзячы на шматлікія сведчанні і доказы датычнасці да дадзеных знікненняў высокіх службовых асобаў рэжыму.

У дачыненні да чатырох прадстаўнікоў сілавых структураў, якія падазраюцца ў знікненні палітычных апанентаў у Беларусі — Уладзіміра Навумава (былы міністр унутраных спраў), Віктара Шэймана (былы кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта), Юрыя Сівакова (у перыяд знікнення палітыкаў займаў пасаду кіраўніка МУС) і Дзмітрыя Паўлічэнкі (камандзір брыгады спецназа ўнутраных войскаў МУС) уведзеныя санкцыі Еўрасаюза з 2015 года[22].

18 снежня 2019 года прыпыпенае папярэдняе следства па крымінальнай справе Захаранкі Ю.М., Ганчара В.І. і Красоўскага А.С. было ўзноўленае ў сувязі з інтэрв'ю былога байца спецпадраздзелу Юрыя Гараўскага, размешчанага 16 снежня 2019 года на сайце радыёстанцыі «Нямецкая хваля»[23]. 18 сакавіка 2020 года ўзноўленае папярэдняе следства па гэтых крымінальных справах было прыпыненае ў сувязі з невыяўленнем асобы, якая належыць да прыцягнення ў якасці абвінавачанага. Па стане на кастрычнік 2023 года статус спраў па фактах знікненняў родным і грамадскасці невядомы.

У той жа час, у верасні 2023 года ў Швейцарыі была разгледжаная крымінальная справа ў дачыненні да Юрыя Гараўскага аб гвалтоўных знікненнях Юрыя Захаранкі, Віктара Ганчара і Анатоля Красоўскага, распачатая ў межах універсальнай юрысдыкцыі. Былы сілавік заяўляў пра тое, што з'яўляецца сведкам выкраданняў і забойстваў вышэйназваных палітыкаў. Суд апраўдаў былога беларускага спецназаўца[24].

21 https://www.kommersant.ru/doc/1499061
22 https://www.delfi.lt/ru/abroad/belorussia/es-na-chetyre-mesyaca-zamorazhivaet-sankcii-protiv-belarusi-69259290
23 https://www.currenttime.tv/a/belarus-lukashenko-murder/30328487.html
24 https://www.bbc.com/russian/articles/c98dlv0lnvxo

# Смерці і забойствы пасля жніўня 2020 года

*«Яны зрабілі з майго ўнука кавалак мяса.*
*Яны павінны адказаць за гэта...»*

З развітальнага слова бабулі чалавека,
які загінуў у РАУС.

Аўтары агляду прааналізавалі выпадкі 16 смерцяў праз віну рэжыму, якія адбыліся падчас і пасля пратэстных падзеяў у жніўні 2020 года.

У адносінах да дадзеных смерцяў можна класіфікаваць парушэнні абавязанняў дзяржавы наступным чынам.

Парушэнне негатыўных абавязанняў *(забароны на адвольнае пазбаўленне жыцця):*

1. Неабгрунтаванае і/ці несувымернае ўжыванне сілы падчас пратэстаў:
   - ужыванне агнявой зброі;
   - выкарыстанне «несмяротных» узбраенняў і спецсродкаў;
   - гвалтоўныя знікненні і далейшыя магчымыя пазасудовыя смяротныя пакаранні.
2. Катаванні і жорсткае абыходжанне ва ўстановах пенітэцыярнай сістэмы (смерці ў зняволенні).

Парушэнне пазітыўных абавязанняў *(абавязкі па абароне жыцця):*

1. Непрыняцце эфектыўных мераў па прадухіленні/спыненні гвалту з боку прыватных асобаў (падчас пратэстаў, у пенітэцыярнай сістэме і г.д.).
2. Ненаданне своечасовай і кваліфікаванай медыцынскай дапамогі (нядбайнасць, бяздзеянне, мэтанакіраванае давядзенне да крытычнага стану здароўя).
3. Адмова ад правядзення эфектыўнага расследавання і/ці прыцягнення да адказнасці вінаватых, у тым ліку неінфармаванне родных і грамадскасці пра ход і вынікі расследавання (беспакаранасць вінаватых у смерцях).
4. Адмова ў наданні кампенсацыі сем’ям ахвяраў.

Варта адзначыць, што палітычна матываваныя прысуды пасля 2020 года сталі адным з асноўных сродкаў барацьбы з апанентамі рэжыму і іншадумцамі, аж да іх фізічнага знішчэння. У кастрычніку 2020 года на той момант Міністр унутраных спраў Рэспублікі Беларусь Юрый Караеў у сваёй прамове на сходзе сілавікоў заявіў пра Сяргея Ціханоўскага: «*Няма на яго артыкула — трэба прыдумаць і пасадзіць яго надоўга. Няхай там сядзіць! Няхай здохне там!*»[25].

Як правіла, праверкі па фактах палітычных забойстваў і смерцяў па палітычных матывах заканчваюцца адмовай у завядзенні крымінальных спраў. Праводзячы такія праверкі, сілавікі фальсіфікуюць судова-медыцынскія экспертызы, скажаюць ці знішчаюць доказы і ціснуць на сведкаў гэтых злачынстваў. Сваякам высылаюцца толькі апавяшчэнні пра адмову ў завядзенні крымінальных спраў, самі пастановы пра адмову ў завядзенні крымінальных спраў у пераважнай большасці выпадкаў не высылаюцца. Родным не дазваляюць знаёміцца з пастановамі і іншымі матэрыяламі праверак, тым самым абмяжоўваючы магчымасць абскарджвання.

Расследаванні смерцяў зняволеных цягнуцца гадамі, Следчы камітэт Рэспублікі Беларусь шматразова адмаўляе ў завядзенні крымінальных спраў у дачыненні да сілавікоў і вінаватыя застаюцца беспакаранымі.

Агульная для ўсіх гэтых інцыдэнтаў акалічнасць: не распачатая ніводная крымінальная справа па фактах смерцяў, а рэжым адмаўляе сваю віну ў гэтых смерцях.

25 https://legin.info/posts/335

# Смерці і забойствы ўдзельнікаў пратэстных выступаў

Ва ўсіх апісаных выпадках смерці людзей надышлі праз палітычныя рэпрэсіі рэжыму, якія суправаджаюцца гвалтам — агнявымі параненнямі ўдзельнікаў пратэстаў, збіццём падчас затрымання на акцыях і ў аддзяленнях міліцыі, псіхалагічным уздзеяннем з боку сілавікоў.

Два мужчыны былі расстраляныя ўзброенымі «праваахоўнікамі» падчас мірных акцый у Мінску (Аляксандр Тарайкоўскі) і Брэсце (Генадзь Шутаў). У выніку ціску з боку прадстаўнікоў Следчага камітэта 18-гадовы Дзмітрый Стахоўскі скончыў жыццё самагубствам, выкінуўшыся з 16-га паверха сталічнага інтэрната.

У гэтым ланцугу смерцяў шырока вядомымі сталі забойствы Рамана Бандарэнкі[26], які выйшаў абараняць ад вандалаў свой двор, і Андрэя Зельцара, IT-спецыяліста, які ва ўласнай кватэры абараняў ад невядомых у цывільнай вопратцы жыллё і сям'ю. Да абодвух злачынстваў датычныя сілавікі спецыяльных падраздзелаў МУС і КДБ Рэспублікі Беларусь.

Асобна варта адзначыць падазроныя выпадкі «суіцыдаў» шляхам павешання людзей, якія непасрэдна ўдзельнічалі ў акцыях пратэсту ці з'яўляюцца знакавымі фігурамі ў агульнай карціне масавага непадпарадкавання пасля сфальсіфікаваных выбараў. Так, быў знойдзены мёртвым член выбарчай камісіі Канстанцін Шышмакоў, які адмовіўся падпісаць выніковы пратакол; актывіст прафсаюза «Нафтан» Уладзімір Крысёнак здзейсніў суіцыд пасля трохдзённай «апрацоўкі» сілавікамі ў РАУС; актыўны ўдзельнік пратэстаў у Маладзечна Мікіта Крыўцоў быў знойдзены павешаным у лесапаласе.

Пералічаныя факты вельмі паказальныя ў дадзеным кантэксце і могуць разглядацца як акты помсты і запалохвання з боку рэжыму.

## 1. Аляксандр Тарайкоўскі

**Бэкграўнд:** 34 гады, жыў у г. Мінску, знаходзіўся ў грамадзянскім шлюбе і выхоўваў дачку малога ўзросту.

**Дата смерці:** 10 жніўня 2020 г. (каля 23:00)

**Месца смерці:** г. Мінск, вул. Прытыцкага, побач са станцыяй метро «Пушкінская»

**Абставіны інцыдэнту**

Па інфармацыі яго грамадзянскай жонкі Алены Герман, якую яна дала журналістам TUT.by, 10 жніўня 2020 года каля 20:00 Аляксандр «пайшоў у кватэру бацькі, якая знаходзілася прыблізна ў 300 метрах ад станцыі метро «Пушкінская» (у гэтай кватэры яны з бацькам рабілі рамонт). Сышоў ён «з пустымі рукамі» — у шортах, майцы, узяўшы з сабой тэлефон, пачак цыгарэт, грошы і банкаўскія карткі. Каля 22:20 жонка патэлефанавала яму, і ён паведаміў, што знаходзіцца на Пушкінскай плошчы, што там «жах што робіцца» і што ён ідзе дадому. Потым яна тэлефанавала яму на мабільны тэлефон у дзве гадзіны ночы, гудкі ішлі, але адказу не было. З яе словаў, яна шукала яго два дні, і толькі пад канец другога дня з бацькам Аляксандра звязаўся следчы і паведаміў яму пра смерць сына»[27].

Згодна з афіцыйнай заявай МУС Беларусі, «10 жніўня, каля 23:00, падчас масавых беспарадкаў у Мінску на вул. Прытыцкага натоўп будаваў барыкады для блакавання руху. Падчас супрацьстаяння са спецназам, які прыбыў для дэблакавання плошчы, адзін з пратэстоўцаў спрабаваў кінуць нявызначаную выбуховую прыладу ў бок праваахоўнікаў. Яна ўзарвалася ў руцэ, мужчына атрымаў траўмы, несумяшчальныя з жыццём»[28].

Аднак, паводле сцвярджэнняў сведкаў таго, што адбылося, Тарайкоўскі быў застрэлены сілавікамі[29].

Фота і відэазапісы інцыдэнту, апублікаваныя незалежнымі СМІ ў наступныя некалькі дзён, канчаткова абверглі версію МУС, паколькі не дэманстравалі ніякіх прыкметаў выбуху[30]. Тры розныя

26 Пазіцыя беларускіх праваабарончых арганізацый па факце смерці Рамана Бандарэнкі. 16.11.2020 г. https://spring96.org/ru/news/100435
27 https://web.archive.org/web/20201127213614/https:/news.tut.by/society/696350.html
28 https://t.me/pressmvd/1891
29 https://web.archive.org/web/20201129100217/https://news.tut.by/society/696236.html
30 https://www.youtube.com/watch?v=4HyPpsR200Y, https://www.youtube.com/watch?v=D_wGVaOxKxk

відэазапісы, зробленыя з розных ракурсаў, выразна паказваюць мужчыну ў белай майцы і шортах, які ў адзіночку набліжаецца да шыхту сілавікоў, з пустымі рукамі, якія ён падчас руху падымае, тым самым дэманструючы свае мірныя намеры. Сілавікі бачылі, што гэты чалавек не здзяйсняе ніякіх гвалтоўных дзеянняў і не ўяўляе для іх ніякай пагрозы. Нягледзячы на гэта, адзін з іх здзяйсняе ў кірунку Аляксандра выстрал. Пасля гэтага на відэазапісе бачна, як мужчына хістаецца, на яго футболцы ў раёне грудзей з'яўляецца вялікая чырвоная пляма, і потым ён падае на зямлю.

Праведзенае па адкрытых крыніцах расследаванне Conflict Intelligence Team (група расійскіх незалежных блогераў, якія займаюцца расследаваннем абставінаў узброеных канфліктаў па адкрытых крыніцах) пацвердзіла месца здарэння, ідэнтыфікавала ўжытую зброю і ўсталявала, што смяротны выстрал быў здзейснены сілавіком аднаго са спецпадраздзелаў: «Альфа» (КДБ) ці «Алмаз» (МУС)[31]. Пазней іншае незалежнае расследаванне, праведзенае пад эгідай «Беларускага народнага трыбунала», са спасылкай на інсайдарскую інфармацыю назвала імя байца «Алмаза», які меркавана здзейсніў смяротны выстрал[32].

Хаця прадстаўнікі рэжыму ў выніку публічна прызналі, што Тарайкоўскі быў застрэлены з «несмяротнай» зброі[33], яны сцвярджалі, што сіла да яго была ўжытая правамерна, паколькі ён нібыта правакаваў сілавікоў[34].

Паводле версіі аднаго з незалежных расследаванняў[35], смяротны выстрал здзейсніў баец СПБТ (спецпадраздзелу па барацьбе з тэрарызмам МУС РБ) «Алмаз» Мікіта Каровін. Камандзір атрада на момант падзей — палкоўнік Віктар Зураеў. Аднак дадзеная версія нічым не пацверджаная і падпадае пад сур'ёзную крытыку.

**Афіцыйная прычына смерці**

Згодна са сведчаннем пра смерць ад лекара, смерць Тарайкоўскага наступіла ў выніку адкрытай раны груднай клеткі і масіўнай страты крыві. Судмедэкспертка, якая назірала ўскрыццё цела Тарайкоўскага, пацвердзіла, што прычынай яго смерці стаў здзейснены з блізкай адлегласці выстрал гумавай куляй у вобласці сэрца[36].

**Меркавана вінаваты ў смерці (калі вядома):** старэйшы следчы следчага ўпраўлення В. Ганчарук[37].

**Рэакцыя афіцыйных уладаў/расследаванне (стадыя)**

10 лютага 2021 года Упраўленне Следчага камітэта РБ па г. Мінску прыняло рашэнне пра адмову ў завядзенні крымінальнай справы па факце смерці Аляксандра Тарайкоўскага «за адсутнасцю складу злачынства»[38].

Згодна з каментаром старшыні СК Івана Наскевіча, у момант здарэння Тарайкоўскі «знаходзіўся ў стане моцнага алкагольнага ап'янення», сваімі дзеяннямі «правакаваў супрацоўнікаў праваахоўных органаў», і «яны ўспрымалі яго як рэальную пагрозу жыццю і здароўю як супрацоўнікаў, так і саміх пратэстоўцаў», у сувязі з чым праваахоўнікі ўжылі ў дачыненні да яго несмяротную зброю «з бяспечнай адлегласці, якая выключае смяротны вынік». Аднак, «у сілу збега шэрага трагічных абставінаў адно з параненняў апынулася пранікальным, у выніку якога смерць Тарайкоўскага наступіла на месцы здарэння»[39]. Паводле версіі следства, «супрацоўнікі праваахоўных органаў у дадзеных умовах і ў падобнай абстаноўцы мелі права выкарыстоўваць несмяротную зброю для прадухілення больш цяжкіх наступстваў»[40].

Старшыня КДБ Беларусі Іван Церцель прычыну ўжывання зброі ў дачыненні да мірнага грамадзяніна пракаментаваў па-свойму: «выйшаў — і нахабна стаіць перад міліцыяй, мэтанакіравана». Пра гэта ён заявіў на сустрэчы з супрацоўнікамі «Гродна Азота» 17 снежня 2020 года[41].

31 https://citeam-ru.medium.com/к-убийству-протестующего-в-минске-могут-быть-причастны-бойцы-спецназа-2ecf73674393
32 http://web.archive.org/web/20220604010522/https://narodny-tribunal.info/ru/investigation#tag5
33 https://web.archive.org/web/20210125224108/https://news.tut.by/economics/696888.html (інтэрв'ю былога міністра ўнутраных спраў Юрыя Караева, 16.08.2020)
34 https://nashaniva.com/?c=ar&i=265466 (расшыфроўка выступу старшыні КДБ Івана Церцеля, 17.12.2020)
35 http://web.archive.org/web/20220604010522/https://narodny-tribunal.info/ru/investigation#tag5
36 https://www.bbc.com/russian/features-59306484
37 https://euroradio.fm/ru/pravovaya-iniciativa-sledstvie-priostanovilo-proverku-po-delu-taraykovskogo
38 Шосты перыядычны даклад, дадзены Беларуссю ў Камітэт ААН супраць катаванняў згодна з артыкулам 19 Канвенцы (CAT/C/BLR/6), п. 131, https://tbinternet.ohchr.org/_layouts/15/treatybodyexternal/Download.aspx?symbolno=CAT%2FC%2FBLR%2F6&Lang=ru
39 https://www.belta.by/incident/view/noskevich-rasskazal-podrobnosti-proverki-po-faktu-smerti-tarajkovskogo-429444-2021/
40 https://www.belta.by/incident/view/noskevich-rasskazal-podrobnosti-proverki-po-faktu-smerti-tarajkovskogo-429444-2021/
41 https://nashaniva.com/?c=ar&i=265467&lang=ru

У красавіку 2021 года СК адмовіў сям'і Тарайкоўскага і Альвіне Мінгазавай, адвакатцы, якая прадстаўляла іх інтарэсы, у магчымасці азнаямлення з матэрыяламі папярэдняй праверкі (у тым ліку з заключэннем судова-медыцынскай экспертызы) і атрыманні копіі адмовы ў завядзенні крымінальнай справы са спасылкай на ч. 2 арт. 178 КПК, згодна з якой «права азнаёміцца з матэрыяламі праверкі па заяве ці паведамленні пра злачынства маюць заяўнік і сама асоба, у дачыненні да якой прынятае рашэнне пра адмову ў завядзенні крымінальнай справы» (праверка па факце смерці Тарайкоўскага была пачатая на аснове паведамлення службовай асобы гарадской станцыі хуткай медыцынскай дапамогі)[42].

Сведка забойства, які быў згодны даваць афіцыйныя паказанні, быў вымушаны пакінуць Беларусь у верасні 2020 года пасля таго, як у яго кватэру прабраліся неизвестные[43].

У чэрвені 2021 года Алена Герман, удава Аляксандра Тарайкоўскага і маці яго 4-гадовай дачкі, паведаміла СМІ пра тое, што падатковая інспекцыя запатрабавала ад яе заплаціць падатак у суме больш за 11 000 рублёў з добраахвотных ахвяраванняў грамадзянаў, якія яна атрымала пасля смерці мужа[44].

Пры даследчай праверцы па факце смерці А. Тарайкоўскага ўсталявана, што зброя і спецыяльныя сродкі супрацоўнікамі ОУС у дачыненні да апошняга ўжытыя правамерна, таму 10 лютага 2021 года адмоўлена ў завядзенні крымінальнай справы з-за адсутнасці складу злачынства[45].

**Выснова**

Дзяржава ў выпадку смерці А. Тарайкоўскага не выканала сваіх абавязанняў (*забарона на адвольнае пазбаўленне жыцця)*. Падчас правядзення мірнага масавага сходу супраць грамадзянаў былі выведзеныя ўзброеныя падраздзелы, якія неабгрунтавана ўжылі зброю ў дачыненні да няўзброенага грамадзяніна, які стаяў з паднятымі рукамі, не падаваў ніякіх прыкметаў агрэсіі, пагрозаў або супраціву.

Такім чынам, дзяржава парушыла міжнародныя стандарты, якія тычацца парадку правядзення масавых мерапрыемстваў, ролі і задачаў праваахоўных органаў у іх, допушчальнасці ўжывання сілы падчас мірных сходаў, забароны на ўжыванне агнявой зброі, у тым ліку гумавых куляў з металічным сардэчнікам. Акрамя таго, дзяржава не правяла эфектыўнага расследавання і/ці прыцягнення да адказнасці вінаватых, не інфармавала сваякоў і грамадскасць пра ход расследавання і яго вынікі. Матэрыяльнага пакрыцця шкоды сям'і ахвяры дзяржава не надала.

## 2. Андрэй Зельцар

**Бэкграўнд:** 31 год, жыў з жонкай і 8-гадовым сынам у г. Мінску, з'яўляўся IT-менеджарам EPAM Systems; выклаў два фотаздымкі з БЧБ-сімволікай у сябе ў Інстаграм, пад адной з іх, апублікаванай 16 жніўня 2020 года, заклікаў людзей аб'ядноўвацца і «ісці да канца»[46].

**Дата смерці:** 28 верасня 2021 г.

**Месца смерці:** уласная кватэра па вул. Якубоўскага ў Мінску.

**Абставіны інцыдэнту**

Як вынікае з паведамлення Камітэта дзяржаўнай бяспекі (далей — КДБ), 28 верасня 2021 года супрацоўнікамі праваахоўных органаў праводзіліся спецыяльныя мерапрыемствы па адпрацоўцы адрасоў, па якіх маглі знаходзіцца асобы, датычныя да тэрарыстычнай дзейнасці.

На апублікаваным дзяржаўнымі СМІ відэа[47] адлюстраваная нарэзка кадраў пра тое, як праходзілі падзеі па адрасе жыхарства загінулага ў Мінску. На відэа бачна, як людзі ў цывільнай вопратцы патрабуюць ад гаспадароў адчыніць дзверы кватэры. Адзін раз гэтыя людзі кажуць пра тое, што з'яўляюцца супрацоўнікамі міліцыі, пасля гэтага яны ўскрываюць дзверы кватэры балгаркай і ломам і ўрываюцца ўсярэдзіну. На іншых кадрах, знятых ужо знутры памяшкання, бачна мужчыну з паляўнічай зброяй. Пачынаецца перастрэлка. Адзін з тых, хто ўварваўся ў кватэру, падае, відаць кроў. На 26-й секундзе відэа з'яўляюцца кадры, знятыя знутры кватэры — на іх бачны Андрэй

42 https://web.archive.org/web/20210421032343/https:/news.tut.by/society/725334.html
43 https://www.svaboda.org/a/30862276.html
44 https://www.rferl.org/a/belarus-protester--widow-donations-taxed/31311168.html, https://gazetaby.media/post/vdove-tarajkovskogo-nalogovaya-vystavila-schet-poc/177033/
45 Шосты перыядычны даклад, пададзены Беларуссю згодна з артыкулам 19 Канвенцыі супраць катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных ці прыніжальных для годнасці відаў абыходжання і пакарання ў Камітэт супраць катаванняў у адпаведнасці са спрошчанай працэдурай падачы дакладаў, што належыць да падачы ў 2022 годзе, CAT/C/BLR/6.
46 https://www.bbc.com/russian/news-58762762
47 https://www.youtube.com/watch?v=aEP5PvIY4SY&rco=1

Зельцар са зброяй. Бачна, як тое, што адбываецца, таксама здымае на тэлефон Марыя Успенская, жонка загінулага, якая знаходзіцца ў пакоі.

З паведамленняў на сайце КДБ вынікае, што «падчас правядзення спецыяльных мерапрыемстваў па адпрацоўцы адрасоў, у якіх маглі знаходзіцца асобы, датычныя да тэрарыстычнай дзейнасці, у адной з кватэраў жылога дома па супрацоўніках праваахоўных органаў асабліва небяспечным злачынцам са зброі быў адкрыты агонь на знішчэнне, у выніку чаго супрацоўнік Камітэта дзяржбяспекі быў смяротна паранены. Агнём у адказ злачынца быў знішчаны. Супрацоўнік ад атрыманых ранаў сканаў. Следчым камітэтам Рэспублікі Беларусь распачатая крымінальная справа па ч.2 арт.139 (забойства асобы ў сувязі з ажыццяўленнем ім службовай дзейнасці)»[48].

Як паведаміў BYPOL, ва ўварванні дадому да Андрэя Зельцара прымаў удзел і загінуў баец групы «А» КДБ Федасюк Дзмітрый Юр'евіч, 1990 года нараджэння, маці якога, Таццяна Мікалаеўна Федасюк, з'яўляецца кіраўніцай аднаго з падраздзелаў цэнтральнага апарата КДБ[49].

**Афіцыйная прычына смерці:** застрэлены скрыжаваным агнём супрацоўнікам КДБ.

**Меркавана вінаваты ў смерці (калі вядома):** сілавікі, якія прымалі ўдзел ва ўварванні ў жыллё А. Зельцара, кіраўнік КДБ — Іван Церцель.

**Рэакцыя афіцыйных уладаў/расследаванне (стадыя)**

Следчым камітэтам Рэспублікі Беларусь распачатая крымінальная справа па ч.2 арт.139 (забойства асобы ў сувязі з ажыццяўленнем ёй службовай дзейнасці). Марыя Успенская, жонка загінулага, была затрыманая па падазрэнні ў саўдзеле забойства супрацоўніка КДБ. Экспертыза выявіла ў жанчыны псіхічны разлад. Яе судзілі як «асобу, якая здзейсніла грамадска небяспечнае дзеянне, у стане непрытомнасці». Мінскім гарадскім судом у складзе суддзі Валянціны Зянькевіч Марыі было прызначанае прымусовае лекаванне ў псіхіятрычным стацыянары да выздараўлення. Акрамя таго, суд спагнаў з абвінавачанай матэрыяльную кампенсацыю маральнай шкоды ў памеры 100 тысяч рублёў на карысць жонкі Дзмітрыя Федасюка, якія будуць залічаныя на карысць дзіцячага дома № 5 г. Мінска. Да цяперашняга часу Марыя знаходзіцца ў РНПЦ псіхічнага здароўя ў Навінках[50].

Паводле сведчанняў Праваабарончага цэнтра «Вясна», «за каментары, рэпосты і публікацыі ў сацсетках у сувязі са справай Зельцара былі затрыманыя не менш за 124 чалавекі. Праваабаронцам вядомыя вынікі судоў над 103 людзьмі, а вынікі па яшчэ 11 справах пакуль высвятляюцца. Трох чалавек асудзілі да абмежавання волі, яшчэ 99 чалавек асуджаныя да пазбаўлення волі ў калоніях. У «Пералік фізічных асобаў, датычных да тэрарыстычнай дзейнасці» КДБ уключыў як мінімум 35 фігурантаў «справы Зельцара», сярод іх — чатыры жанчыны»[51].

Генадзь Мажэйка, супрацоўнік «Камсамольскай праўды ў Беларусі», напісаў нататку, прысвечаную загінуламу падчас перастрэлкі Андрэю Зельцару, дзе выклаў думку яго аднакласніцы пра загінулага. 23 сакавіка 2023 года суддзя Мінскага гарадскога суда Таццяна Фалькоўская прызнала Генадзя Мажэйку вінаватым у абразе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (ч.1 арт. 368 КК), у наўмысных дзеяннях, скіраваных на распальванне сацыяльнай варожасці па прыкмеце іншай сацыяльнай прыналежнасці (ч.1 арт. 130 КК)[52]. Дзяржабвінаваўцай у дадзеным працэсе была пракурорка аддзела дзяржабвінавачання генпракуратуры Беларусі Таццяна Гаркун.[53] Мажэйку Г. М. канчаткова прызначанае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін тры гады з адбыццём у папраўчай калоніі ва ўмовах агульнага рэжыму[54]. 11 верасня 2023 г. ПЦ «Вясна» паведаміў, што Генадзя этапавалі ў папраўчую калонію «Віцьба-3».[55]

**Выснова**

Ажыццяўленне сілавікамі КДБ спецыяльнага мерапрыемства па спыненні дзеянняў асобаў, датычных да тэрарыстычнай дзейнасці, прайшло з грубымі парушэннямі правоў чалавека і ведамасных інструкцый, правілаў і працэдураў, якія рэгламентуюць падобныя мерапрыемствы.

Сілавікі, якія знаходзіліся без апазнавальных знакаў, у штацкім адзенні, з ужываннем спецсродкаў узламалі дзверы ў жыллё грамадзяніна. Пры гэтым яны не прадставіліся, не паведамілі прычыны

48 http://kgb.by/ru/news-ru/view/v-xode-provedenija-spetsialnyx-meroprijatij-po-otrabotke-adresov-v-kotoryx-mogli-naxoditsja-litsa-prichastnye-199/
49 https://belsat.eu/ru/news/29-09-2021-bypol-nazval-imya-sotrudnika-kgb-ubitogo-vchera-v-minske
50 https://spring96.org/ru/news/110804
51 https://spring96.org/ru/news/110804
52 https://prisoners.spring96.org/ru/person/henadz-mazheika
53 https://sputnik.by/20230323/zhurnalist-kp-v-belarusi-mozheyko-prigovoren-k-3-godam-lisheniya-svobody-1073549155.html
54 https://t.me/supremecourtofbelarus/783
55 https://prisoners.spring96.org/ru/person/henadz-mazheika

ўварвання. У гэты час напалоханыя Андрэй Зельцар і яго жонка двойчы тэлефанавалі ў міліцыю, просячы пра дапамогу і апісваючы сітуацыю. Супрацоўнікі дзяжурнай службы, куды паступалі званкі ад пацярпелых, не далі ніякіх тлумачэнняў сям'і, не правялі інструктаж пра неабходныя дзеянні. Абараняючы сваё жыллё і сваю сям'ю, Андрэй Зельцар, у мэтах самаабароны, не ведаючы сапраўдных прычынаў уварвання невядомых, выстраліў са сваёй паляўнічай стрэльбы ва ўзброеных людзей, якія ўварваліся ў кватэру. У адказ на гэта ён быў тут жа застрэлены сілавікамі.

Такім чынам, дзяржавай парушаныя асноўныя міжнародныя стандарты і нацыянальныя нормы абароны жыцця чалавека, у выніку чаго адбылася смерць Андрэя Зельцара: права на недатыкальнасць жылля, неправамернае ўжыванне агнявой зброі. Належнае расследаванне інцыдэнту дзяржавай не праведзенае. Матэрыяльную кампенсацыю праз выпадак страты кармільца сям'я загінулага не атрымала. Жонка загінулага памешчаная на прымусовае лекаванне на нявызначаны тэрмін у псіхіятрычную клініку, якая ва ўмовах рэпрэсіўнага рэжыму з'яўляецца карным органам і можа быць выкарыстаная для помсты за дзеянні мужа.

## 3. Генадзь Шутаў

**Бэкграўнд:** 44 гады, жыў у г. Брэсце разам з грамадзянскай жонкай і дачкой. Дата смерці**:** 19 жніўня 2020 г. (у 10:20). Быў паранены 11 жніўня 2020 г.

**Месца смерці:** вайсковы шпіталь у Мінску.

### Абставіны інцыдэнту

Дачка Шутава Анастасія Баранчук распавяла СМІ, што ўвечары 11 жніўня 2020 года бацька патэлефанаваў ёй і паведаміў, што збіраецца дадому, і з таго часу сям'я не магла яго знасці два дні. Яго тэлефон быў недасяжны. Калі яго нарэшце знайшлі ў Брэсцкай абласной бальніцы, ён знаходзіўся ў коме з дыягназам «адкрытае пранікальнае агнявое параненне чэрапа, удар — раструшчванне галаўнога мозгу, шматаскепкавы пералом скляпення чэрапа з пераходам на аснову»[56]. 13 жніўня ў крытычным стане яго верталётам даставілі ў шпіталь Міністэрства абароны ў Мінску, дзе ён сканаў зранку 19 жніўня[57].

19 жніўня 2020 года, паведамляючы пра смерць Шутава, Следчы камітэт заявіў, што ўвечары 11 жніўня два мужчыны «здзейснілі напад на асобаў, якія выконвалі задачы па ахове грамадскага парадку», «наносілі ўдары, выкарыстаўшы металічную трубу, а таксама зрабілі спробу завалодання агнявой зброяй»[58]. Адзін з праваахоўнікаў, «успрымаючы дзеянні падазраваных як рэальную пагрозу жыццю і здароўю і спыняючы спробы завалодаць табельнай зброяй, ужыў у дачыненні да нападніка зброю, выстраліўшы ў кірунку пляча», але «з прычыны працягу актыўнага супраціву мужчыны, ненаўмысна параніў яго ў вобласць галавы».

Відэазапісы інцыдэнту, знятыя сведкамі і камерамі відэаназірання, якія былі апублікаваныя ў СМІ, паставілі афіцыйную версію падзеяў пад сур'ёзны сумнеў. На кадрах бачна, як тры чалавекі ў штацкім адзенні падыходзяць да Шутава і яго сябра Кардзюкова, якія стаялі каля лаўкі. Потым паміж імі, відаць, узнік непрацяглы канфлікт, у выніку якога Кардзюкоў паспрабаваў збегчы, а адзін з афіцэраў пагнаўся за ім. Менавіта ў гэты момант прагучалі тры выстралы, адзін з якіх і параніў Шутава[59].

### Афіцыйная прычына смерці

У даведцы пра смерць Шутава сказана, што яе прычынай стаў траўматычны ацёк галаўнога мозгу. У пункце «знешняя прычына смерці» пазначаны код МКБ Y22 (расшыфроўваецца як «пашкоджанне ў выніку выстралу з ручной агнявой зброі з нявызначанымі намерамі»).

**Меркавана вінаваты ў смерці (калі вядома):** камандзір групы выведкі 1-га асаблівага атрада спецыяльнага прызначэння 5-й асобнай брыгады спецыяльнага прызначэння УС РБ (в/ч 89417), капітан Раман Гаўрылаў. Загад пра прыцягненне ўзброеных спецназаўцаў да аховы правапарадку аддаў камандуючы войскамі сілаў спецыяльных аперацый Беларусі генерал-маёр Вадзім Дзенісенка.

---

56 https://mediazona.by/article/2020/09/03/shutov/, https://belsat.eu/ru/news/vystrely-v-tishi-ranenyj-v-breste-protestuyushhij-skonchalsya-versii-ochevidtsev-i-mvd-rashodyatsya, https://www.currenttime.tv/a/belarus-shutov-killings/30821707.html
57 https://t.me/minzdravbelarus/1123
58 https://t.me/skgovby/2960
59 https://mediazona.by/article/2020/09/21/shutov-cctv, https://t.me/nashaniva/11487, https://t.me/belsat/13974

**Рэакцыя афіцыйных уладаў/расследаванне (стадыя)**

З моманту здарэння ўлады сцвярджалі, што Шутаў і яго сябар Аляксандр Кардзюкоў напалі на сілавікоў, якім давялося абараняцца. 12 жніўня 2020 года ў МУС паведамілі, што напярэдадні ўвечары на супрацоўнікаў міліцыі ў Брэсце «напала група агрэсіўна настроеных грамадзянаў з арматурай у руках», «папераджальныя выстралы ўверх іх не спынілі» і «для абароны жыцця і здароўя супрацоўнікаў зброя была ўжытая на знішчэнне», адзін з нападнікаў быў паранены[60].

3 верасня 2020 года Следчы камітэт адмовіўся праводзіць праверку па факце забойства Шутава, спаслаўшыся на тое, што «прававая ацэнка дзеянням асобаў, датычных да нанясення пакалечанняў Шутаву Г.В., будзе дадзеная падчас расследавання крымінальнай справы», адкрытай 12 жніўня супраць яго і Кардзюкова за напад на праваахоўнікаў[61].

Падчас суда па гэтай справе, які адбыўся ў лютым 2021 года, стала вядома, што Шутава застрэліў капітан 5-й вайсковай брыгады спецыяльнага прызначэння Раман Гаўрылаў. Разам з прапаршчыкам той жа брыгады Арсеніем Галіцыным ён атрымаў загад дапамагаць АМАПу ў патруляванні пратэстаў у Брэсце, змешваючыся з натоўпам у штацкім, але маючы пры сабе табельную зброю. Неабходнасць ужывання зброі Гаўрылаў патлумачыў тым, што ён «адчуваў сябе дрэнна», а нападнікі паводзілі сябе агрэсіўна[62].

25 лютага 2021 года Брэсцкі абласны суд у асобе суддзі Крэменеўскай Святланы пасмяротна прызнаў Шутава вінаватым у «супраціве іншай асобе пры выкананні ёй абавязкаў па ахове грамадскага парадку, спалучаным з ужываннем гвалту» без прызначэння пакарання, а ключавы сведка яго забойства Кардзюкоў быў асуджаны да 10 гадоў пазбаўлення волі[63]. Дзяржаўным абвінаваўцам у дадзеным працэсе быў пракурор Генадзь Буры[64]. Кардзюкоў і сваякі Шутава абскардзілі прысуд, але 14 траўня 2021 года ён быў пакінуты ў сіле Вярхоўным судом[65]. Беларускія праваабаронцы прызналі абвінавачанні ў дачыненні да абодвух мужчынаў і прысуд ім палітычна матываванымі[66].

**Выснова**

Вайсковаслужбоўцы асаблівага атрада спецыяльнага прызначэння 5-й асобнай брыгады спецыяльнага прызначэння УС РБ незаконна ўжылі табельную зброю ў дачыненні да мірнага грамадзяніна, які не супраціўляўся, Генадзя Шутава, цяжка параніўшы яго. У выніку цяжкіх траўмаў ён сканаў. Прадстаўнікі рэжыму ўсяляк адмаўляюць незаконнае ўжыванне зброі і хаваюць любыя доказы, абвінаваціўшы пры гэтым саму ахвяру і сведку інцыдэнту ў нападзе на сілавікоў.

Такім чынам, дзяржава парушыла міжнародныя стандарты, якія тычацца парадку правядзення масавых мерапрыемстваў, ролі і задачаў праваахоўных органаў у іх, дапушчальнасці ўжывання сілы падчас мірных сходаў, забароны на ўжыванне агнявой зброі. Дзяржава не правяла эфектыўнага расследавання па факце смерці. Матэрыяльную кампенсацыю сваякам ахвяры не выплацілі.

## 4. Дзмітрый Стахоўскі

**Бэкграўнд:** 18 гадоў, сірата з нараджэння, жыў у г. Мінску; стаў фігурантам крымінальнай справы па частцы 2 артыкула 293 КК (пра «масавыя беспарадкі») пасля таго, як супрацоўнікі інтэрната, дзе ён жыў, паказалі на яго як на ўдзельніка акцый пратэсту 9-10 жніўня 2020 года.

**Дата смерці:** 26 траўня 2021 г.

**Месца смерці:** вул. К. Тураўскага ў Мінску.

**Абставіны інцыдэнту**

Паводле паведамлення УСК па г. Мінску 26 траўня 2021 года каля 01:45 з прыкметамі падзення з вышыні ля дома на вул. К. Тураўскага было знойдзенае цела 18-гадовага мінчука. Следча-аператыўнай групай праведзены агляд месца здарэння, прызначаная судова-медыцынская і пасмяротна псіхолага-псіхіятрычная экспертызы, выкананне якіх даручанае спецыялістам ДКСЭ. Па выніках экспертных доследаў, канцэнтрацыя алкаголя ў крыві маладога чалавека склала 2,4 праміле[67].

60 https://t.me/pressmvd/1895
61 https://people.onliner.by/2020/12/12/kak-idut-proverki-po-delam-pogibshix-vo-vremya-protestov
62 https://mediazona.by/article/2021/02/25/kordukov, https://www.dw.com/ru/kak-sud-v-breste-sudil-ubitogo-uchastnika-protestov-v-belarusi-i-ego-druga/a-56693683
63 https://mediazona.by/article/2021/02/25/kordukov,
64 https://prisoners.spring96.org/ru/person/aljaksandr-kardzjukou, https://spring96.org/ru/news/102140
65 https://www.belta.by/incident/view/verhovnyj-sud-ostavil-bez-izmenenija-prigovor-kordjukovu-441267-2021/
66 https://spring96.org/en/news/103303
67 https://www.belta.by/incident/view/sk-ustanavlivaet-obstojatelstva-smertelnogo-travmirovanija-18-letnego-parnja-v-

Высветлілася, што Дзмітрый Стахоўскі скончыў жыццё самагубствам, скочыўшы з 16-павярховага будынка. Зранку 26 траўня на старонцы яго профіля ў сацыяльнай сетцы «ВКонтакте» з'явіўся пост, у якім у здзейсненым самагубстве ён абвінавачваў Следчы камітэт.

Сябар Дзмітрыя казаў, што загінулы не вытрымаў падману з боку следчага. Так, Стахоўскаму абяцалі, што абвінавачанне зменяць і артыкул 293 («Масавыя беспарадкі») заменяць на больш мяккі 342 («Удзел у дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак»). «Яго абнадзеілі, паабяцалі змякчэнне абвінавачання ў абмен на прызнанне. І ён ні з кім з блізкіх яму людзей не параіўся і напісаў гэтае прызнанне. Распавядаў мне потым, маўляў, следчая добрая, паабяцала, калі я прызнаюся, што прымаў удзел у беспарадках ля «Рыгі», то іншыя эпізоды, удзел у іншых шэсцях не будуць нават разглядацца. І ён зрабіў так, як яму сказалі, прызнаўся, што катаў нейкія катушкі, ставіў краты ў раёне ўніверсама «Рыга»». 25 траўня 2021 года Дзмітрый разам з адвакатам хадзіў на чарговы допыт, і прабыў у Следчым камітэце пяць ці шэсць гадзінаў, да 21:00. Там ён даведаўся, што яго ўвялі ў зман, паабяцаўшы змену кваліфікацыі злачынства. Як яму паведамілі, следчая хадайнічала наконт замены, але пракурор адмовіў у задавальненні гэтага хадайніцтва[68].

Паводле паведамленняў сяброў памерлага, ён неаднаразова казаў, што не хоча сядзець у турме і выхадам з усяго будзе самагубства. Са словаў яго сяброў, пасля допыта 25 траўня 2021 года ён паехаў у раён Уручча і забраўся на дах 16-павярховага дома. Адтуль пісаў сябрам, «што не зможа так жыць, прасіў у іх прабачэння. Казаў, што хоча напіцца, таму што яму страшна, і не хочацца здзяйсняць такі ўчынак, але ў турме ён сядзець не будзе»[69].

**Афіцыйная прычына смерці:** суіцыд.

**Меркавана вінаваты ў смерці (калі вядома)**: следчая, якая праводзіла следчыя дзеянні ў дачыненні да Дзмітрыя Стахоўскага па частцы 2 артыкула 293 КК.

**Рэакцыя афіцыйных уладаў/расследаванне (стадыя)**

Праверка па дадзеным факце праводзілася Першамайскім раённым аддзелам Следчага камітэта г. Мінска.

14 чэрвеня 2021 года ў Telegram-канале Генеральнай пракуратуры была размешчаная заява службы інфармацыі пракуратуры г. Мінска, у якой напісана, што ў сувязі з паступленнем у пракуратуру г. Мінска шматлікіх электронных зваротаў па пытанні завядзення крымінальнай справы па факце смерці Дзмітрыя Стахоўскага тлумачыцца, што ў адпаведнасці з артыкуламі 138, 139 Крымінальна-працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь правам абскарджвання дзеянняў і рашэнняў органа, які вядзе крымінальны працэс, валодаюць удзельнікі крымінальнага працэса шляхам падачы скаргі ў вуснай ці пісьмовай форме, а таксама іншыя фізічныя і юрыдычныя асобы, калі працэсуальныя дзеянні, якія праводзяцца, і рашэнні закранаюць іх інтарэсы. Падача скаргаў у электроннай форме крымінальна-працэсуальным законам не прадугледжаная. Звароты, пададзеныя асобамі, не надзеленымі адпаведным правам, да разгляду па сутнасці не належаць[70].

Рэжым, адмаўляючы ў завядзенні крымінальнай справы па факце давядзення да самагубства, цынічна спаслаўся на заканадаўчую норму пра абскарджванне рашэнняў органа толькі ўдзельнікамі крымінальнага працэса ці іншымі асобамі, інтарэсы якіх закранутыя. Пракуратуры дакладна вядома, што загінулы быў сірата і абскардзіць дзеянні следчага ў дадзеным выпадку няма каму.

**Выснова**

Нягледзячы на безумоўнае права грамадзянаў на свабоду меркаванняў і права на ўдзел у мірных пратэстах, рэжым жорстка пераследуе іх, пазбаўляючы свабоды на працяглыя тэрміны.

У выпадку з Дзмітрыем Стахоўскім, маладога хлопца, з няўстоянай псіхікай, які не мае падтрымкі і дапамогі сям'і, у парушэнне артыкула 27 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, следчая вымусіла прызнацца ў здзяйсненні шэрага дзеянняў, у выніку чаго яго прававая пазіцыя па справе пагоршылася. На працягу доўгага часу яго неаднаразова выклікалі на допыты, псіхалагічна ціснулі, пагражалі доўгімі тэрмінамі пазбаўлення волі, прымушаючы прызнацца ў здзяйсненні злачынстваў, прыніжалі яго чалавечую годнасць, што адказвае складу злачынства «Давядзенне да самагубства» (артыкул 145 КК).

---

minske-443118-2021/

68 https://belsat.eu/ru/news/09-06-2021-v-nashej-zhizni-teper-pustota-o-parne-kotoryj-prygnul-s-16-etazha-iz-za-davleniya-sk-rasskazali-druzya-i-italyanskaya-semya

69 https://belsat.eu/ru/news/26-05-2021-zakonchil-kursy-programmirovaniya-horosho-zarabatyval-chto-izvestno-o-parne-kotoryj-vybrosilsya-s-16-go-etazha-iz-za-presledovaniya-sk

70 https://t.me/prokuraturabelarus/1037

У дадзеным выпадку дзяржава парушыла міжнародныя стандарты выбарчых правоў грамадзянаў, права грамадзянаў на мірныя сходы, права на справядлівы суд, права на жыццё. Дзяржава не правяла эфектыўнага расследавання па факце смерці Дзмітрыя Стахоўскага.

Наяўнасць дакументаў: перадсмяротны пост Дзмітрыя Стахоўскага на яго старонцы ў сацыяльнай сетцы «ВКонтакте».


Дима Меркулов
два часа назад

Если вы это читаете, значит меня нет в живых.

Вина тому, стал следственный комитет. Уже не секрет, что у меня была уголовная статья 293 ч.2. В кратце, за митинги. Если бы на меня не продолжали морально давить, думаю, я бы не решился на такой ужасный поступок как суицид. Но мои силы были на исходе. И как вы можете видеть, я не справился. Да, мне много кто говорил, не переживай все будет хорошо. Не думай о плохом. Плохие мысли прочь. Однако легко говорить пока сам не окажешься в таком положении.

Очень сильно жалею о том, что прожил так мало. А ведь ещё пару лет назад, строил планы на будущее, что поеду снова за границу, буду там жить и работать. Но жизнь она ведь такая не предсказуемая. Или думаете я когда нибудь мог бы подумать, что буду стоять перед таким выбором? Тяжёлым выбором. Поэтому сказать что суицид это решение всех твоих проблем, не могу. Нет друзья. Это не правильный выбор. Это самый что ни есть ужасный выбор. Живите. Жизнь надо ценить. Она у вас одна и другой у вас уже точно не будет.

В завершении моей предсмертной записки, хочу выразить огромную благодарность моим друзьям, знакомым и просто тем людям, которые мне встречались на пути моей короткой жизни. А также спасибо тем людям которые мне на протяжении многих лет помогали. Все вы невероятные и я всегда всех любил. Любил помогать и делать добро, чтоб уходя на тот свет, оставить хоть что нибудь от себя. Хотяб кусочек доброты.

Будьте чутка добрее и вообще. Живите на позитиве.

## 5. Канстанцін Шышмакоў

**Бэкграўнд:** 29 гадоў, працаваў дырэктарам Ваенна-гістарычнага музея імя Баграціёна ў г. Ваўкавыску; з'яўляўся чальцом выбарчай камісіі на ўчастку для галасавання №16 у 2-й сярэдняй школе Ваўкавыска.

**Дата смерці:** 15 жніўня 2020 г.

**Месца смерці:** лясны масіў у адным кіламетры ад г. Масты.

**Абставіны інцыдэнту**

Бацькі Канстанціна, Святлана і Андрэй Шышмаковы, апісваюць апошнія дні жыцця сына так: «Калі пачалася выбарчая кампанія, Канстанцін не хацеў ісці ў выбарчую камісію. Але ў загадным парадку яго ўключылі ў яе склад. 9 жніўня, убачыўшы фальсіфікацыі, ён разам з калегам адмовіўся падпісаць выніковы выбарчы пратакол»[71].

Старшыня выбарчай камісіі на ўчастку №16 Яніна Таранеўская адмаўляла, што Канстанцін адмовіўся падпісваць выніковы пратакол[72].

Каля 23:00 9 жніўня маці прыйшло смс-паведамленне ад Канстанціна: «Я дабраўся дадому, усё нармальна. У Ваўкавыску б'юць людзей». Святлана патэлефанавала яму. У тэлефоннай размове Канстанцін паведаміў маці, што пасля сканчэння галасавання і падліку галасоў выбарчую камісію на аўтамабілях развезлі па дамах. Але ён разам з калегам сышоў з участка пешкі, паколькі ім не

71 https://people.onliner.by/2020/08/20/pogib-direktor-muzeya
72 https://people.onliner.by/2020/08/20/pogib-direktor-muzeya

было чаго саромецца. Таксама Канстанцін распавядаў бацькам, што 9 жніўня ў раёне 17-18 гадзінаў яму паступіла ўказанне ехаць за горад, з сабой яму выдалі стос бюлетэняў і загадалі адвезці іх у выбаркам. За горадам нейкія людзі ўручылі Канстанціну нейкія бюлетэні і сказалі адвезці ў выбаркам. Але Канстанцін зразумеў, што гэта фальшывыя бюлетэні, і адмовіўся іх укідваць у скрыні для галасавання[73].

Увечары 15 жніўня 2020 года Канстанцін патэлефанаваў жонцы і сказаў: «Я тут працаваць больш не буду, еду дадому»[74]. Аднак дома ён так і не з'явіўся. Праз тры дні, 18 жніўня 2020 года, цела Канстанціна Шышмакова было знойдзена пошукава-ратавальным атрадам «Ангел» у лесапаласе каля горада Масты (прыблізна ў 30-ці кіламетрах ад Ваўкавыска) павешаным.

Маці загінулага Святлана распавядала, што побач з целам сына стаяла турыстычнае крэсла, якое ён вазіў з сабой у аўтамабілі, ногі дакраналіся да зямлі. Таксама Святлана згадвала, што ў Мастах казалі, што сын, калі яго знайшлі, быў цалкам мокры, хаця тады не было дажджоў. Святлана распавяла, што следчы па заканчэнні праверкі настойліва рэкамендаваў не адкрываць пакет з адзеннем, у якім быў Канстанцін. Але калі родныя ўсё ж разгарнулі пакет, адзенне, штаны, бялізна — усё было абсалютна чыстае. Бацька Канстанціна казаў, што ў сына знайшлі гематомы і драпіны на целе, але ў пасмяротным заключэнні пішацца, што гэта не стала прычынай смерці. Пытанне пра тое, адкуль яны з'явіліся, нават не ўздымалася. Таксама прысутнічаў след на руцэ, нібыта кісць рукі была прывязаная да шчыкалаткі. Акрамя дзіўнай сітуацыі з адзеннем, якое не магло ў такой сітуацыі быць абсалютна чыстым, былі незразумеласці з яго тэлефонам. Ён быў пад паролем, следчы ў Ваўкавыску некалькі разоў спрабаваў падабраць пароль, але не атрымалася. Таму, каб цалкам не заблакаваць тэлефон, ён сказаў, што тэлефонам зоймецца спецыяліст. Тэлефон адправілі ў Мінск, месяцы два там яго «ламалі», у заключэнні экспертызы пазначана, што тэлефон быў скінуты да заводскіх наладаў. Але на заводскіх наладах пароль не прадугледжаны[75].

**Афіцыйная прычына смерці:** суіцыд.

**Меркавана вінаваты ў смерці (калі вядома):** не ўсталяваны.

**Рэакцыя афіцыйных уладаў/расследаванне (стадыя)**

19 жніўня 2020 года афіцыйная прадстаўніца ўпраўлення СК па Гродненскай вобласці Іна Пазняк паведаміла «РИА Новости», што Следчы камітэт Беларусі праводзіць праверку ў сувязі са смерцю дырэктара ваенна-гістарычнага музея ў Ваўкавыску, які не падпісаў пратакол падліку галасоў на прэзідэнцкіх выбарах. Папярэдне ўсталявана, што яна не носіць крымінальнага характару[76].

27 лістапада 2020 года ў завядзенні крымінальнай справы па факце самагубства дырэктара УК «Ваўкавыскі ваенна-патрыятычны музей імя Баграціёна» К. Шышмакова было адмоўлена[77].

**Высновы**

Канстанцін Шышмакоў з'яўляўся чальцом выбарчай камісіі, адмовіўся ўдзельнічаць у фальсіфікацыі вынікаў выбараў, не падпісаў выніковы пратакол падліку галасоў. Праз гэта на яго адбываўся моцны псіхалагічны ціск прадстаўнікамі дзяржавы (кіраўніцтвам выбарчай камісіі). Гэтыя факты даюць падставу адносіць дадзеную смерць да смерцяў, у якіх можа быць задзейнічаная дзяржава. У падобных выпадках для выключэння дзяржавы з вінаватых у смерці менавіта прадстаўнікі праваахоўных органаў зацікаўленыя ў старанным і бессаронnім расследаванні.

У выпадку смерці Канстанціна Шышмакова дзяржава не правяла эфектыўнага расследавання, не давяла яго вынікаў да сям'і загінулага. Дапушчальнымі ў дадзеным інцыдэнце ўяўляюцца варыянты давядзення да самагубства (артыкул 145 КК РБ) або забойства з інсцэнаваннем суіцыду (артыкул 139 КК РБ).

## 6. Мікіта Крыўцоў

**Бэкграўнд:** 28 гадоў, жыў у г. Жодзіна разам з жонкай і маленькай дачкой; быў актыўным футбольным фанатам, з часоў каледжа заўзеў за ФК ''Маладзечна'' і, са словаў сябра, даўно ўдзельнічаў у

73 https://belsat.eu/ru/news/09-03-2021-ya-ne-veryu-v-suitsid-roditeli-pogibshego-direktora-volkovysskogo-muzeya-rasskazali-o-syne
74 https://ru.stranafund.org/blog/istorii-geroev/konstantin-shishmakov-6-zhertva-avgusta-2020
75 https://belsat.eu/ru/news/09-03-2021-ya-ne-veryu-v-suitsid-roditeli-pogibshego-direktora-volkovysskogo-muzeya-rasskazali-o-syne
76 https://ria.ru/20200819/1575976168.html
77 Шосты перыядычны даклад, пададзены Беларуссю ў Камітэт ААН супраць катаванняў згодна з артыкулам 19 Канвенцыі (CAT/C/BLR/6), п. 131, https://tbinternet.ohchr.org/_layouts/15/treatybodyexternal/Download.aspx?symbolno=CAT%2FC%2FBLR%2F6&Lang=ru

нацыянальна настроеным фанацкім руху, у культурных і палітычных акцыях. Меў татуіроўкі: на назе — з выявай Якуба Коласа, на грудзях — з гербам горада і надпісам «Толькі Маладзечна», а пад ім — партрэт Максіма Багдановіча[78]; у апошні час з сябрам размаўляў толькі на беларускай мове.

**Дата смерці:** 22 жніўня 2020 г. — дата знаходжання цела, пазначаная ў пасведчанні пра смерць. 12 жніўня 2020 г. — дата знікнення, пазначаная на месцы пахавання.

**Месца смерці:** цела было знойдзенае ў лесапаласе паблізу вул. Парніковай у Мінску.

**Абставіны інцыдэнту**

9 жніўня 2020 года Мікіта ўдзельнічаў у мірнай акцыі пратэсту супраць фальсіфікацыі выбараў прэзідэнта на плошчы ў Маладзечна. На відэа[79] зафіксавана, як ён адзін стаіць у некалькіх метрах насупраць шыхту сілавікоў, у руках трымае нацыянальны бела-чырвоны-белы сцяг, ззаду стаіць натоўп пратэстоўцаў. На відэа бачна, што твар Мікіты не быў схаваны пад маскай[80].

Журналісты «Нашай Нівы» ўзнавілі наступны ланцужок падзеяў апошніх дзён жыцця Мікіты Крыўцова. «Пасля ўдзелу ў акцыі пратэсту ў г. Маладзечна 9 жніўня 2020 года Мікіта пасля поўначы паведаміў сябру, што знаходзіцца ў Жодзіна. 10 жніўня 2020 года Мікіта казаў сябру па тэлефоне, што ён быў у Мінску, ледзь не трапіўся ў рукі АМАПа на Нямізе. Распавядаў, што ў яго атрымалася схавацца і перачакаць нейкі час. У момант званка Арцёму ён зноў вяртаўся ў Жодзіна. 11 жніўня Мікіта стэлефаноўваўся з сябрам у раёне 10 раніцы, яны абмяркоўвалі тое, што ўдзельнікам пратэстаў па чутках даюць ад 8 да 15 гадоў. З раніцы 12 жніўня 2020 года мабільны тэлефон Мікіты быў ужо недасяжны»[81].

Паводле інфармацыі ад жонкі і брата загінулага, якую прывялі журналісты выдання Onlíner, «зранку 11 жніўня Мікіта зайшоў дадому да жонкі і сказаў, што на яго хочуць павешаць арганізацыю масавых беспарадкаў. Ён узяў пару рэчаў і сышоў. У абед 12-га ён павінен быў быць на працы ў Каралёў Стане пад Мінскам, але там ён так і не з’явіўся»[82].

Паводле версіі следства, «Крыўцоў 11 жніўня 2020 года, знаходзячыся ў адным са сталічных бараў, пазнаёміўся з двума маладымі людзьмі. Пасля сумеснага ўжывання спіртных напояў мужчыны накіраваліся па месцы жыхарства аднаго з іх, дзе працягнулі распіваць алкаголь. Зранку 12 жніўня Крыўцоў сышоў з кватэры ў невядомым кірунку. Абодва грамадзяніны былі вызначаныя і апытаныя. З іх словаў, на целе Мікіты якіх-небудзь пашкоджанняў яны не бачылі, ён пры іх не падаў. Маладыя людзі таксама адзначылі: падчас гутаркі Крыўцоў неаднаразова выказваў асцярогі, што яго могуць прыцягнуць да адказнасці за арганізацыю несанкцыянаваных мітынгаў у Маладзечна і ўдзел у іх.

Акрамя таго, следчымі знойдзены відэазапіс, на якім бачна, як Крыўцоў каля 7:00 гадзінаў 12 жніўня 2020 года адзін рухаецца ў кірунку лесу, дзе пасля і было знойдзенае яго цела. Відэаматэрыялы таксама сведчаць пра адсутнасць у яго якіх-небудзь пакоджанняў на целе»[83].

Паводле словаў брата загінулага, маецца сведка, які сцвярджае, што бачыў Мікіту на МКАД, падвозіў яго на вул. Парніковую. Хлопец быў збіты і распавядаў яму пра сваё затрыманне 12 жніўня 2020 года.[84] Таксама ў родных ёсць некалькі крыніцаў, якія сцвярджалі, што бачылі Мікіту на Акрэсціна, адзін з іх нават сцвярджаў, што бачыў, як яму скруцілі шыю. Аднак, дадзеная інфармацыя нічым не пацвярджаецца, сваю асобу азначаныя людзі не раскрываюць[85].

Апошні раз нумар тэлефона Крыўцова быў зафіксаваны ў РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі ў Мінску[86]. Як тлумачыў брат загінулага Павел Кухто: ‘’…з’явілася інфармацыя пра тое, што яго тэлефон уключыўся ў РНПЦ нейрахірургіі. Аднак раскідванне сігнала можа быць на адлегласці ад 100 да 500 метраў. Дзе канкрэтна ўключаўся мабільны тэлефон Мікіты, невядома. Але што цікава — побач у гэтым раёне ёсць УУС Мінскага райвыканкама»[87].

---

78 Са жніўня 2020 года наяўнасць татуіровак на целе, асабліва нацыянальнага зместу, сілавыя структуры адносяць да матэрыялаў экстрэмісцкага зместу, што з’яўляецца нагодай для пераследу грамадзянаў, аж да крымінальнага пакарання ў выглядзе пазбаўлення волі. Пры затрыманні такіх грамадзянаў збіваюць і ўжываюць да іх самыя жорсткія меры ўздзеяння ў месцах утрымання.

79 https://nashaniva.com/?c=ar&i=259077&lang=ru

80 https://t.me/molovTG/572

81 https://nashaniva.com/?c=ar&i=259077&lang=ru

82 https://people.onliner.by/2020/09/02/brat-najdennogo-mertvym-nikity-krivcova-rasskazyvaet-podrobnosti-ego-propazhi

83 https://minsknews.by/usk-po-g-minsku-prinyato-reshenie-po-materialu-proverki-po-faktu-smerti-28-letnego-nikity-krivczova/

84 https://nashaniva.com/?c=ar&i=259077&lang=ru

85 https://nashaniva.com/ru/317599

86 https://belsat.eu/ru/news/ne-boyalsya-pokazat-svoi-vzglyady-v-molodechno-proshhayutsya-s-protestuyushhim-kotorogo-nashli-poveshennym-v-minske

87 https://people.onliner.by/2020/09/02/brat-najdennogo-mertvym-nikity-krivcova-rasskazyvaet-podrobnosti-ego-propazhi

Увечары 22 жніўня 2022 года цела Мікіты знайшоў вартаўнік дачнага каапературыва, які размешчаны недалёка. На здымку, зробленым вартаўніком, відаць, што Мікіта стаіць на зямлі. Вартаўнік казаў, што побач з целам ляжаў пень, але следчыя не звярнулі на яго ўвагу і не забралі як рэчыўны доказ. «З кішэні шортаў тырчаў пашпарт, а побач з целам валяўся чахол ад тэлефона. Сябры і маці загінулага сцвярджаюць, што гэты чахол не належаў Мікіту, хаця быў вернуты маці следчым пасля заканчэння расследавання. Але сябры сцвярджаюць, што чахла ў Мікіты ніколі не было»[88].



Фота з сайта «Наша Ніва»

Па сцвярджэнні маці загінулага Анжалікі Кухто, яе былому мужу, бацьку Мікіты, сказалі сілавікі: «Калі вы адчыніце гэтую труну і будзеце глядзець, то [пагражае] аж да крымінальнай адказнасці»[89].

**Афіцыйная прычына смерці:** суіцыд.

**Меркавана вінаваты ў смерці (калі вядома):** не ўсталяваны.

**Рэакцыя афіцыйных уладаў/расследаванне (стадыя)**

23 жніўня 2020 года Следчы камітэт у сваім Telegram-канале апублікаваў наступную інфармацыю: «Учора, 22 жніўня, у лесапаласе блізка ад аднаго з дамоў на вул. Парніковай у Мінску знойдзенае цела 28-гадовага маладога чалавека без прыкметаў жыцця. На месца здарэння выязджала следча-аператыўная група. Паводле папярэдніх дадзеных, смерць не носіць крымінальны характар, бачных пашкоджанняў на целе няма. Паводле гэтага факта праводзіцца праверка, па выпадку ўзнікнення прычынаў смерці прызначаная судова-медыцынская экспертыза, вытворчасць якой даручаная спецыялісту ДКСЭ»[90].

У сакавіку 2021 года кіраўнік аддзела Следчага ўпраўлення УСК па г. Мінску Віктар Грамовіч[91] паведаміў, што «па выніках праверкі следчым упраўленнем УСК па г. Мінску па факце смерці М.

88 https://nashaniva.com/?c=ar&i=259077&lang=ru
89 https://nashaniva.com/ru/317599
90 https://t.me/skgovby/2971
91 https://www.the-village.me/village/city/news-city/287671-krivtsov-result

Крыўцова ў завядзенні крымінальнай справы адмоўлена за адсутнасцю ў чыіх-небудзь дзеяннях склада злачынства. Выснова пра самагубства М. Крыўцова зробленая на аснове абставінаў, зафіксаваных на месцы знаходжання трупа: адсутнасць слядоў барацьбы і валачэння як на месцы здарэння, так і на целе, высноваў судова-медыцынскай экспертызы пра прычыны і час надыходу смерці, а таксама іншых матэрыялаў праверкі. Варта адзначыць, што, згодна з заключэннем эксперта, акрамя странгуляцыйнай барозны на шыі, якая магла ўтварыцца пры зацягванні пятлі пад дзеяннем уласнай вагі, на целе знойдзенае кровазліццё ў мяккіх тканінах правай і левай галёнкі. Падчас праверкі следчыя прыйшлі да высновы, што з улікам блізкага размяшчэння цела да ствала дрэва азначаныя пашкоджанні Крыўцоў мог атрымаць у стадыі экспіраторнай аддышкі, якая, як правіла, суправаджаецца рэзка выражанымі сутаргавымі рухамі цела. Якіх-небудзь іншых траўматычных прыжыццёвых пашкоджанняў цела на трупе мужчыны не выяўлена»[92].

Родных Мікіты Крыўцова з матэрыяламі праверкі не азнаёмілі, копію пастановы пра адмову ў завядзенні крымінальнай справы не ўручылі, нягледзячы на тое, што заяўніцай з'яўлялася жонка загінулага.

Даследчай праверкай не ўсталяваныя асобы, вінаватыя ў надыходзе смерці Мікіты Крыўцова, які здзейсніў паводле версіі праваахоўнікаў суіцыд, роўна як і асобаў, якія схілілі яго да самагубства. 22 лютага 2021 года прынятае рашэнне пра адмову ў завядзенні крымінальнай справы за адсутнасцю склада злачынства[93].

**Выснова**

Сведчанні з афіцыйных крыніцаў інфармацыі выклікаюць вялікія сумневы, паколькі разыходзяцца са сведчаннямі блізкіх, сведкаў, а таксама з рознымі доказамі. На скрыншоце з відэазапісу следства, дзе заяўляецца, што 12 жніўня 2020 года Мікіта адзін рухаецца ў кірунку лесу, немагчыма ўсталяваць асобу чалавека, бачнага на відэа.

У перыяд са жніўня 2020 года ўдзельнікаў пратэстаў з татуіроўкамі, а тым больш з беларускімі сімваламі, сілавікі збівалі з асаблівай стараннасцю. У сетцы інтэрнет маецца нямала доказаў актыўнага ўдзелу Мікіты Крыўцова ў акцыях пратэстаў. На адным з відэа Мікіта, не хаваючы твару, з нацыянальным сцягам ходзіць уздоўж ачаплення міліцыі. Дадзеныя факты могуць казаць пра магчымае затрыманне і збіццё Мікіты, некалькі сведкаў кажуць пра гэта. Акрамя таго, сведкі заяўляюць, што сам Мікіта сур'ёзна непакоіўся за перaслед і затрыманні за ўдзел у акцыях.

Улічваючы, што дзяржава не правяла эфектыўнага расследавання і не давяла яго вынікаў да сям'і пацярпелага, дакладна сцвярджаць, якія яшчэ абавязанні (акрамя самога расследавання) парушыла дзяржава, не выяўляецца магчымым. Дапушчальнымі выяўляюцца варыянты: забойства (артыкул 139 КК РБ) або наўмыснае чыненне цяжкага пашкоджання, якое пацягнула па неасцярожнасці смерць (частка 3 артыкула 147 КК РБ).

## 7. Раман Бандарэнка

**Бэкграўнд:** 31 год, жыў у г. Мінску. Пасля выбараў 2020 года падтрымліваў пратэстныя актыўнасці ў сваім двары.

**Дата смерці:** 12 лістапада 2020 г.

**Месца смерці:** рэанімацыйнае аддзяленне БХМД у Мінску.

**Абставіны інцыдэнту**

11 лістапада 2020 года позна ўвечары ў двары шматкватэрнага дома нумар 58 па вуліцы Чарвякова ў Мінску (шырока вядомым як «Плошча пераменаў», папулярнае месца пратэсту) з'явілася група невядомых (пазней апазнаных як прадстаўнікі блізкага атачэння Лукашэнкі, сярод іх Наталля Эйсмант (прэс-сакратар Прэзідэнта Беларусі), Дзмітрый Баскаў (старшыня Федэрацыі хакея Беларусі), асобы, звязаныя з сілавымі структурамі, Дзмітрый Шакута (інструктар спецпадрыхтоўкі ў в/ч №3214 і 3032 (САХР) унутраных войскаў), Яўген Ціманоўскі (старэйшы прапаршчык САХРа) і іншыя). Яны пачалі зразаць бела-чырвона-белыя стужкі, якія ўпрыгожвалі тэрыторыю двара. Паміж імі і мясцовымі жыхарамі завязалась перапалка, у якую ўмяшаўся Раман Бандарэнка.

92 https://minsknews.by/usk-po-g-minsku-prinyato-reshenie-po-materialu-proverki-po-faktu-smerti-28-letnego-nikity-krivczova/

93 Шосты перыядычны даклад, пададзены Беларуссю ў Камітэт ААН супраць катаванняў згодна з артыкулам 19 Канвенцыі (CAT/C/BLR/6), п. 131, https://tbinternet.ohchr.org/_layouts/15/treatybodyexternal/Download.aspx?symbolno=CAT%2FC%2FBLR%2F6&Lang=ru

На відэа, знятых відавочцамі і камерамі відэаназірання, выразна відаць, як невядомыя зацягваюць Бандарэнку ў мікрааўтобус і з'язджаюць.[94]

Рамана Бандарэнку даставілі ў Цэнтральны РУУС Мінска ўжо ў крытычным стане. Праз дзве гадзіны хуткая дапамога звезла Рамана, які знаходзіўся ў коме, у рэанімацыю бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі. У бальніцу мужчыну даставілі з ацёкам мозгу, закрытай чэрапна-мазгавой траўмай і шматлікімі гематомамі. Лекары правялі яму складаную шматгадзінную аперацыю на мозгу. 12 лістапада Бандарэнка сканаў ад атрыманых траўмаў, не прыходзячы ў свядомасць.[95]

Журналісцкія расследаванні, праведзеныя TUT.by, «Медыязонай» і групай ByPol, узнавілі храналогію падзеяў увечары 11 лістапада, якая абвяргае афіцыйную версію, а таксама ідэнтыфікавалі датычных да інцыдэнту, што пацвярджаецца дадзенымі білінга сотавай сувязі і «злітымі» аўдыязапісамі праслухоўвання тэлефонных перамоваў.[96]

**Афіцыйная прычына смерці:** у пасведчанні пра смерць у пункце «прычына смерці» напісаны код S06.5 («траўматычнае субдуральнае кровазліццё»).

**Меркавана вінаватыя ў смерці:** Дзмітрый Баскаў (старшыня Федэрацыі хакея Беларусі), Дзмітрый Шакута (інструктар спецпадрыхтоўкі ў в/ч №3214 і 3032 (САХР) унутраных войскаў), Яўген Ціманоўскі (старэйшы прапаршчык САХРа, барацьбіт ММА[97]), Сяргей Сарман (старэйшы групы САХРа) і група байцоў САХРа (в/ч 3032, г. Мінск), Аляксей Бабкоў (намеснік кіраўніка АКР Цэнтральнага РУУС г. Мінска, адказны дзяжурны з 11 на 12 лістапада 2020), Дзмітрый Балаба (камандзір мінскага АМАПа).

**Рэакцыя афіцыйных уладаў/расследаванне (стадыя)**

Улады першапачаткова ўводзілі грамадскасць у зман, заявіўшы, што Раман быў у стане алкагольнага ап'янення[98]. Лабараторныя аналізы гэтага не пацвердзілі[99]. Пасля былі арыштаваныя карэспандэнтка TUT.by Кацярына Барысевіч, якая паведаміла пра тое, што ў крыві Бандарэнкі на момант смерці не было алкаголю, і лекар Арцём Сарокін, які даў вынікі медыцынскага абследавання Рамана. 2 сакавіка 2021 г. суддзя суда Маскоўскага раёна г. Мінска Бандарэнка Святлана асудзіла Барысевіч да шасці месяцаў пазбаўлення волі і аштрафавала на 100 базавых велічыняў (2 900 рублёў), на што пасля Генеральная пракуратура падала апеляцыйны пратэст у суд, палічыўшы прысуд занадта «мяккім».[100] Сарокіна асудзілі на два гады пазбаўлення волі з адтэрміноўкай на год і штраф у 50 базавых (1450 рублёў). Дзяржабвінаваўцай у дадзенай справе выступала Людміла Іваненка[101].

Спецслужбы праслухоўвалі тэлефоны блізкіх сваякоў Рамана і ўсталявалі за імі сочку[102].

13 лістапада 2020 года Лукашэнка падчас інтэрв'ю з шэрагам беларускіх і міжнародных СМІ заявіў пра тое, што ён даручыў Генеральнаму пракурору РБ узяць расследаванне абставінаў смерці Бандарэнкі пад «сур'ёзны кантроль»[103].

18 лютага 2021 года было афіцыйна абвешчана пра завядзенне крымінальнай справы па факце смерці Бандарэнкі па частцы 3 артыкула 147 КК (наўмыснае нанясенне цяжкага пашкоджання, якое пацягнула за сабой забойства па неасцярожнасці). Аднак, нягледзячы на ўсе доказы, якія маюцца, у Генпракуратуры заявілі, што датычнасць супрацоўнікаў органаў унутраных спраў да інцыдэнту «не ўсталяваная»[104]. 17 верасня 2021 года следства было прыпыненае на нявызначаны тэрмін «з-за неўсталявання асобы, якая мусіць быць прыцягнутая ў якасці абвінавачанага»[105].

**Выснова**

Падчас пратэстных акцый у Беларусі асобы, якія падтрымліваюць рэжым Лукашэнкі, атрымалі поўную свабоду і гарантыю беспакаранасці за ўсе дзеянні ў барацьбе з любымі праявамі

94 https://www.youtube.com/watch?v=AdNmCK15wFQ , https://www.youtube.com/watch?v=NX82Lb_i9QQ
95 https://web.archive.org/web/20210501220456/https://news.tut.by/society/707678.html
96 https://web.archive.org/web/20210217093838/https://news.tut.by/society/707698.html, https://web.archive.org/web/20210127183226/https://news.tut.by/society/710991.html, https://mediazona.by/article/2020/11/16/bondarenko, https://bypol.org/rassledovaniye-smerti-bondarenko/
97 Змяшаныя баявыя мастацтвы (баі без правілаў).
98 https://t.me/skgovby/3395, https://www.belta.by/president/view/lukashenko-poruchil-vzjat-pod-serjeznejshij-kontrol-rassledovanie-obstojatelstv-smerti-romana-415578-2020/
99 https://web.archive.org/web/20210517160937/https://news.tut.by/society/707715.html
100 https://press-club.pro/underpressure/katerina-borisevich
101 https://spring96.org/ru/news/102226, https://prisoners.spring96.org/ru/person/kacjaryna-barysevicz
102 https://belsat.eu/ru/news/vlasti-okazyvayut-davlenie-na-semyu-romana-bondarenko, https://t.me/motolkohelp/17504
103 https://www.belta.by/president/view/lukashenko-poruchil-vzjat-pod-serjeznejshij-kontrol-rassledovanie-obstojatelstv-smerti-romana-415578-2020/
104 https://www.belta.by/incident/view/genprokuratura-vozbudila-ugolovnoe-delo-po-faktu-smerti-romana-bondarenko-429194-2021/, https://t.me/prokuraturabelarus/718
105 https://t.me/prokuraturabelarus/1340

грамадзянскай актыўнасці. Праўладныя актывісты пад прыкрыццём сілавікоў, знішчаючы нацыянальныя сімвалы і ўпрыгожванні жыхароў у двары іх дома, жорстка збілі Рамана Бандарэнку і адвезлі яго ў Цэнтральны РУУС г. Мінска з пазнакай пра алкагольнае ап'яненне. У выніку нанесеных сілавікамі цяжкіх траўмаў ён сканаў у бальніцы.

Дзяржава парушыла міжнародныя стандарты абароны права на жыццё, нацыянальныя нормы па ажыццяўленні праваахоўнай дзейнасці (неправамернае ўжыванне сілы, ненаданне медыцынскай дапамогі), у далейшым вышэйшымі службовымі асобамі распаўсюджваліся звесткі, якія ганяць Рамана і ўтрымліваюць не толькі асабістую, але і няпраўдзівую інфармацыю пра яго. Эфектыўнага расследавання рэжымам праведзена не было, вынікі расследавання хаваюцца ад блізкіх сваякоў, сапраўдныя вінаватыя ў смерці Рамана Бандарэнкі, нягледзячы на наяўнасць шматлікіх доказаў злачынства, засталіся беспакаранымі. Матэрыяльная кампенсацыя сям'і загінулага не выплачаная.

## 8. Уладзімір Крысёнак

**Бэкграўнд:** 41 год, меў жонку і дзвюх дачок, былы супрацоўнік завода «Нафтан» у г. Наваполацку; восенню 2020 года далучыўся да агульнанацыянальнай забастоўкі, у 2021 годзе быў кандыдатам на пасаду старшыні незалежнага прафсаюза супрацоўнікаў «Нафтан».

**Дата смерці:** 30 траўня 2022 г.

**Месца смерца:** цела было знойдзенае на лецішчы яго маці ў в. Глінішча

**Абставіны інцыдэнту**

24 траўня 2022 года Уладзімір Крысёнак быў затрыманы сілавікамі і праз 72 гадзіны быў адпушчаны пад падпіску пра нявыезд. Знаёмыя Уладзіміра паведамілі праваахоўнікамі, што «прычынай затрымання магла стаць актывізацыя сілавікоў пасля нядаўняй публікацыі ў СМІ відэаролікa[106], дзе бачна нікчэмны тэхнічны стан аб'екта, на якім калісьці працаваў Уладзімір». Сілавікі пры допыце прымушалі яго даць сведчанні на былых калег і пагражалі яму 12 гадамі пазбаўлення волі[107].

Уладзімір Крысёнак быў знойдзены павешаным праз дзень пасля вызвалення. Цела знайшлі 30 траўня 2022 года на лецішчы яго маці ў вёсцы Глінішчы, пахаванне прайшло 1 чэрвеня 2022 года. Уладзіміру Крысёнку быў 41 год. Без бацькі засталіся дзве дачкі, адна з іх непаўнагадовая[108].

**Афіцыйная прычына смерці:** суіцыд.

**Меркавана вінаваты ў смерці (калі вядома):** следчы, сілавікі, якія ажыццяўлялі допыты.

**Рэакцыя афіцыйных уладаў/расследаванне (стадыя):** невядома**.**

**Высновы**

Уладзімір Крысёнак з'яўляўся актыўным удзельнікам незалежнага прафсаюза, быў кандыдатам на пасадзе старшыні, далучыўся да агульнанацыянальнай забастоўкі, што дазваляе аднесці яго да апанентаў дзейнага рэжыму.

У падобных выпадках для выключэння дзяржавы з вінаватых у смерці менавіта дзяржава зацікаўленая ў старанным і бесстароннім расследаванні смерці грамадзяніна.

Пры затрыманні сілавікі псіхалагічна ціснулі на Уладзіміра, беспадстаўна пагражаючы крымінальным пераследам і вялікімі тэрмінамі пакарання, прыніжалі яго чалавечую годнасць, патрабавалі даць дадзеныя пра супрацоўнікаў яго прадпрыемства, тым самым фактычна «здаць» сваіх калег, падвёўшы іх пад рызыку крымінальнага пераследу. Такія дзеянні сілавых структураў, спалучаныя з жорсткім псіхалагічным ціскам, могуць адказваць складу злачынства па артыкуле 145 КК РБ «Давядзенне да самагубства».

У выпадку смерці Уладзіміра Крысёнка дзяржава не правяла эфектыўнага расследавання, не давяла яго вынікаў да сям'і загінулага. Матэрыяльнай кампенсацыі сям'і не выплачана.

106 https://t.me/belsat/75600
107 https://t.me/viasna96/11685
108 https://nashaniva.com/ru/292730

# Смерці зняволеных у месцах пазбаўлення волі пасля 2020 года

Умовы ўтрымання, а таксама інфармацыю пра наданне медыцынскай дапамогі, смерці і суіцыды ў месцах пазбаўлення волі вельмі складана даследаваць з-за адсутнасці доступу да пенітэцыярных устаноў і іншых месцаў зняволення. Афіцыйныя крыніцы не публікуюць такія дадзеныя. Асноўнымі крыніцамі атрымання звестак пра смерці ў месцах пазбаўлення волі з'яўляюцца публікацыі ў незалежных медыя ці ж інфармацыя, дадзеная сваякамі і зняволенымі.

Практычна з пачатку 2023 года палітычныя зняволеныя ў месцах пазбаўлення волі знаходзяцца ў рэжыме інкамунікада[109]. Яны пазбаўленыя права на перапіску, спатканняў са сваякамі і адвакатамі, знаходзяцца ў інфармацыйным вакууме, не асвядомленыя пра падзеі на волі. У гэтым угледжваецца як жаданне рэжыму псіхалагічна зламаць палітычных зняволеных, так і пазбавіць грамадскасць любой інфармацыі пра тое, што адбываецца ў няволі.

Палітычныя зняволеныя[110] ў месцах пазбаўлення волі, асабліва ў калоніях і турмах, належаць да павышанай групы рызыку датычна да захавання здароўя і непасрэдна страты жыцця. Частка з іх належыць да ўразлівых сацыяльных груп з-за свайго ўзросту і стану здароўя. У выніку прамых загадаў вышэйпастаўленага кіраўніцтва супрацоўнікі папраўчых установаў ствараюць для іх жорсткія нечалавечыя ўмовы ўтрымання, змяшчаюць у ШІЗА і ПКТ. Умовы знаходжання там можна прыраўняць да катаванняў[111]: зняволены суткамі знаходзіцца ў вельмі халоднай і вільготнай камеры без цёплага адзення і абутку, належнага асвятлення і харчавання, без спальных прыналежнасцяў, у складаным псіхалагічным стане з-за пастаянных пагрозаў, збіцця і «навешвання» сілавікамі надуманых парушэнняў, без надання неабходнай медыцынскай дапамогі. Усё гэта часта прыводзіць да смерцяў.

Толькі за апошнія гады менавіта з гэтых прычынаў у калоніях памерлі як мінімум тры вядомыя палітычныя зняволеныя — грамадскі актывіст Вітольд Ашурак[112], праваабаронца Мікалай Клімовіч[113] і мастак Алесь Пушкін[114].

Кіраўніцтвам турмаў і калоній, праз супрацоўнікаў і іншых асуджаных,

наўмысна ствараюцца цяжкія псіхалагічныя ўмовы знаходжання для палітычных зняволеных. Людзей з няўстойлівай псіхікай, якія працягла знаходзяцца ў прыгнечаным стане без належнай дапамогі псіхолагаў і псіхіятраў, такая сітуацыя ў месцах пазбаўлення волі прыводзіць да спробаў і здзяйсненняў суіцыдаў (Дзмітрый Дудойць).

Вядомыя таксама выпадкі смерцяў затрыманых пасля жорсткага збіцця ў аддзяленнях міліцыі, падчас затрымання ці ў месцах утрымання адміністратыўна-затрыманых (Аляксандр Віхор, Дзмітрый Сарокін).

Яшчэ адной прычынай смерцяў адміністратыўна арыштаваных па палітычных матывах, якія адбывалі арышты ў ЦІП на Акрэсціна ці іншых месцах утрымання, з'яўляецца COVID-19. Супрацоўнікамі ізалятараў наўмысна ствараюцца жорсткія ўмовы ўтрымання для палітычных зняволеных, чым пагаршалася сітуацыя з захворваннем. Перапоўненасць камераў, якая перавышала нормы ў 4-10 разоў (у чатырохмясцовай камеры магло знаходзіцца 20-30 чалавек), нізкая тэмпература і адключэнне ацяплення, нявыдача медыкаментаў і сродкаў гігіены, недастатковая вентыляцыя ці адключэнне вентыляцыі, ненаданне медыцынскай дапамогі прывялі да незваротных наступстваў для тых, хто захварэў[115]. Пенсіянеры Алена Амеліна і Сяргей Шчацінка, у прыватнасці, памерлі адразу ж пасля вызвалення з ЦІП менавіта з-за наступстваў каранавіруса.

Міжнародны камітэт па расследаванні катаванняў у Беларусі ў сваіх дакументах неаднаразова падкрэсліваў гэтую праблему: «Мэтанакіравана ўтрымліваючы людзей у перанаселеных камерах у разгар пандэміі Covid-19, супрацоўнікі ЦІП паддавалі небяспецы іх здароўе і жыцці. Хворыя і з

109 У практыцы міжнародных праваабарончых механізмаў ён стаіць у адным шэрагу з гвалтоўнымі знікненнямі — адным з самых цяжкіх парушэнняў правоў чалавека.

110 Прызнаныя палітычнымі зняволенымі беларускай праваабарончай супольнасцю. https://spring96.org/ru/news/100870 (Дапаможнік па вызначэнні панятку «палітычны зняволены»).

111 https://spring96.org/ru/news/110574

112 Сумесная заява беларускай праваабарончай супольнасці. 21.01.2021 г. https://spring96.org/ru/news/101555

113 Заява праваабаронцаў пра прызнанне 20 новых палітычных зняволеных. 15.03.2023 г. https://spring96.org/ru/news/111071

114 Заява пра прызнанне мастака Алеся Пушкіна палітычным зняволеным. 06.04.2021 г. https://spring96.org/ru/news/102799

115 https://belsat.eu/ru/news/21-10-2021-u-vas-bylo-vremya-begat-s-flagami-a-u-menya-sejchas-vremeni-net-kak-v-izolyatorah-otnosyatsya-k-bolnym-covid-19

патрэбай у пастаянным прыёме медыцынскіх прэпаратаў, а таксама траўмаваныя і параненыя не атрымлівалі неадкладнай медыцынскай дапамогі, што выклікала цяжкія наступствы для здароўя многіх з іх».[116]

Падобная сітуацыя назіралася не толькі ў Мінску на Акрэсціна, але і ў ізалятарах Баранавічаў, Жодзіна і Магілёва. Затрыманыя паведамлялі, што ў ІЧУ Баранавічаў COVID-19 хварэлі цэлымі камерамі, па 14 чалавек. Медыцынскай дапамогі ім не давалі па некалькі дзён.

Нягледзячы на тое, што гэтыя людзі памерлі не ў сценах ізалятараў, а ў лекарскіх установах і дома пасля вызвалення, эксперты адносяць дадзеныя інцыдэнты да смерцяў, якія адбыліся праз віну рэжыму, з прычыны неналежных умоваў утрымання адміністратыўна арыштаваных і ненадання медыцынскай дапамогі ва ўмовах пандэміі COVID-19.

Неабходна адзначыць, што такія ўмовы ў ЦІПе былі створаныя наўмысна па загадзе вышэйпастаўленага кіраўніцтва — намесніка кіраўніка УУС Мінскага аблвыканкама Максімовіча, які патрабаваў стварыць для затрыманых «камфортныя ўмовы з развbooротам на 180 градусаў»[117].

У дадзеным дакуменце пазначана два выпадкі смерцяў ад COVID-19 пасля адбыцця адміністратыўнага арышту. Аднак у рэальнасці колькасць памерлых сярод тых, хто заразіўся на COVID-19, безумоўна, можа быць большай.

На аснове праведзенага аналізу прыводзім спіс папраўчых установаў пенітэцыярнай сістэмы і органаў МУС Рэспублікі Беларусь, у якіх мелі месца смерці затрыманых і зняволеных у перыяд са жніўня 2020 года па верасень 2023 года. Ва ўсіх гэтых выпадках меркаванымі вінаватымі ў смерцях з’яўляюцца непасрэдныя кіраўнікі папраўчых установаў і РАУС, а таксама кіраўнікі медыцынскіх частак. Усе іх дзеянні/бяздзеянне патрабуюць старанных расследаванняў і прыцягнення вінаватых да адказнасці ў адпаведнасці з нормамі права.

| № пп | Імя, прозвішча памерлага | Дата смерці | Установа | Кіраўнік установы | Кіраўнік медчасткі | Прычына смерці |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | **Аляксандр Віхор** | 12.08.2020 г. | Чыгуначны РАУС Гомеля | Ігар Цімашэнка | Няма такой пасады | «Закрытая чэрапна-мазгавая траўма пад пытаннем» і «кома трэцяй ступені», праблемы з сэрцам. |
| 2. | **Вітольд Ашурак** | 21.05.2021 г. | ВК-17, г. Шклоў | Аляксандр Карніенка | Кіраўніца медыцынскай часткі маёрка ўнутранай службы Наталля Дабрадзеравец | Код R99 — іншыя недакладна вызначаныя і неўдакладненыя прычыны смерці |
| 3. | **Дзмітрый Дудойць** | 05.01.2022 г. | Папраўчая ўстанова адкрытага тыпу №43, г. Магілёў | Таранька Сяргей Юр’евіч | Няма такой па-сады | Суіцыд падчас адбыцця пакарання |
| 4. | **Алена Амеліна** | кастрычнік 2021г. | ЦІП Акрэсціна | Шапецька Яўген Андрэевіч | Няма дадзеных | Смерць ад наступстваў ка-ранавіруснай інфекцыі |
| 5 | **Сяргей Шчацінка** | 11.12.2020 г. | Асіповіцкі ІЧУ | Анікееў Аляксандр Міхайлавіч | Няма такой пасады | Смерць ад наступстваў ка-ранавіруснай інфекцыі |

116 *«Вы* здохнеце тут». Вязні Акрэсціна сведчаць». Грамадскае расследаванне выпадкаў масавых катаванняў у Цэнтры ізаляцыі правапарушальнікаў горада Мінска 9–14 жніўня 2020 года. https://torturesbelarus2020.org/wp-content/uploads/2023/03/okrest%D0%B8na_rus.pdf
117 https://www.youtube.com/watch?v=ywnnLKrJ844

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 6. | **Мікалай Клімовіч** | 05.05.2023 г. | ВК-3, Віцьба, Віцебскі р-н | Аляксей Старавойтаў | Валер Раманаў | Інвалід ІІ групы з-за захворвання сэрцава-судзіннай сістэмы, перанёс інсульт і складаную аперацыю на сэрцы. Смерць ад неналежнага надання медыцынскай дапамогі ў калоніі. |
| 7. | **Алесь Пушкін** | 11.07.2023 г. | Турма № 1,<br><br>г. Гродна | Павел Казакоў | Віктар Лутцаў | Памёр у гарадской бальніцы ад наступстваў запушчанага перытаніту ў выніку перфарацыі прабадной язвы страўніка |
| 8. | **Дзмітрый Сарокін** | 01.06.2023 г. | Лідскі РАУС | Сяргей Сыцэвіч | Няма такой пасады | Праблемы з сэрцам |

# 1. Аляксандр Віхор

**Бэкграўнд:** 25 гадоў, жыў у г. Гомелі з бацькамі, быў спартоўцам, кандыдатам у майстры спорту па плаванні.

**Дата смерці:** 12 жніўня 2020 г. (03:35).

**Месца смерці:** рэанімацыйны аддзел Гомельскай абласной туберкулёзнай клінічнай бальні**цы**.

**Абставіны інцыдэнту**

Паводле словаў маці Віхора Святланы, увечары 9 жніўня 2020 года Аляксандр ехаў на спатканне да сваёй дзяўчыны і павінен быў зрабіць перасадку на плошчы Леніна ў Гомелі, дзе ў той час праходзіла акцыя пратэсту. Калі маці патэлефанавала яму, ён сказаў: «Мяне скруцілі тры амапаўцы і запіхалі ў машыну, не ведаю, куды вязуць». Пасля гэтага яго тэлефон стаў недасяжны. Апошні раз маці размаўляла з ім каля 5 гадзінаў раніцы 10 жніўня, калі ён патэлефанаваў ёй з чужога нумара з Чыгуначнага РАУС і паведаміў, што ў яго «адкаталі пальцы і ўзялі сведчанні». Пасля гэтага сям'я два дні не магла яго нідзе знайсці[118].

11 жніўня Чыгуначны раённы суд Гомеля асудзіў Віхора на 10 сутак арышту. Пасля суда яго даставілі ў Чыгуначны РАУС Гомеля[119].

Паводле расповеду сведкі журналістам інтэрнет-рэсурсу Onliner, у спартовай зале РАУС у Аляксандра здарыўся нервовы зрыў: ён пачаў паводзіць сябе неадэкватна, не падпарадкоўваўся сілавікам. У адказ яны збілі яго дубінкамі. Медыцынская дапамога яму дадзеная не была. Пасля гэтага Віхора этапавалі ў СІЗА Гомеля ў вузкім адсеку знутры аўтазака, дзе яны сядзелі вельмі цесна ўдвух са сведкам, ім не хапала паветра і было немагчыма рухацца. Перавозка ў такіх выпадках доўжылася каля гадзіны. Сведка распавёў, што Аляксандр пачаў трызніць, ён не разумеў, дзе знаходзіцца, клікаў сваякоў і патрабаваў выпусціць яго. У адказ на гэта сілавікі пырснулі ў іх адсек з пярцовага балончыка. Пасля таго, як усіх затрыманых выгрузілі, Віхора пакінулі знутры, а ахоўнікаў папрасілі «правучыць» яго, паколькі, з іх словаў, ён быў наркаманам[120]. Сілавікі жорстка збілі Аляксандра Віхора ў аўтазаку.

Праз дзве-тры гадзіны пасля гэтага Аляксандра прывезлі ў псіхіятрычную бальніцу, дзе яго адмовіліся шпіталізаваць. Потым туды выклікалі машыну хуткай медыцынскай дапамогі, супрацоўнікі якой запісалі, што «пацыент ляжаў на падлозе, скаргаў не выказваў, быў у коме». Карэта «хуткай дапамогі» даставіла Віхора ў абласную туберкулёзную бальніцу (самая блізкая

118 https://web.archive.org/web/20200812211711/https://news.tutby.news/society/696437.html
119 https://spring96.org/ru/news/102625
120 https://people.onliner.by/2020/08/16/kto-to-bryznul-v-nash-otsek-avtozaka-iz-percovogo-ballonchika-ochevidec-rasskazyvaet-kak-oboshlis-s-aleksandrom-vixorom

ўстанова аховы здароўя з аддзяленнем рэанімацыі), дзе яму паставілі дыягназы «закрытая чэрапна-мазгавая траўма пад пытаннем» і «кома трэцяй ступені». Нягледзячы на ўсе высілкі лекараў па яго выратаванні, ён сканаў зранку 12 жніўня 2020 года ў 03.35 гадзінаў[121].

Следчы спачатку паведаміў сваякам, што Аляксандр нібыта памёр ад перадазоўкі наркотыкаў[122], што пасля абверглі вынікі судмедэкспертызы[123].

**Афіцыйная прычына смерці:** вострая недастатковасць кровазвароту, якая развілася праз раптоўнае абвастрэнне наяўных захворванняў сэрцава-судзіннай сістэмы.

**Меркавана вінаваты ў смерці (калі вядома):** сілавікі, якія збівалі ў аўтазаку, кіраўнік Чыгуначнага РАУС г. Гомеля палкоўнік міліцыі Ігар Мікалаевіч Цімашэнка.

**Рэакцыя афіцыйных уладаў/расследаванне (стадыя)**

16 лютага 2021 года Следчы камітэт адмовіў у завядзенні крымінальнай справы па факце смерці Віхора за адсутнасцю склада злачынства[124]. Кіраўнік Упраўлення Следчага камітэта па Гомельскай вобласці Сяргей Удовікаў заявіў, што яго смерць «надышла ў выніку вострай недастатковасці кровазвароту, якая развілася з-за захворванняў сэрцава-судзіннай сістэмы, якія былі» і што «развітае ў Аляксандра Віхора парушэнне псіхічнай дзейнасці маскіравала клінічныя праявы захворванняў сэрца, якія маліся ў яго»[125].

Маці Віхора пацвердзіла, што ў яе сына было хворае сэрца, але гэта не замінала яму жыць нармальным жыццём, нават займацца спортам. Паводле сведчанняў лекараў, Аляксандра даставілі ў рэанімацыю ўжо ў стане клінічнай смерці з ацёкам мозгу[126]. Калі маці забірала цела сына, яна заўважыла, што ў яго зламаныя рэбры і грудзіна, што, паводле версіі Следчага камітэта, нібыта адбылося падчас правядзення рэанімацыйных мерапрыемстваў — непрамога масажу сэрца. Сваякам не быў дадзены доступ да поўнага тэксту заключэння судмедэкспертызы, у ім адсутнічала частак старонак[127].

Святлана Віхор звярталася ў пракуратуру з абскарджваннем законнасці адмовы ў завядзенні крымінальнай справы Следчым камітэтам, аднак як пракуратура Гомельскай вобласці, так і Генпракуратура палічылі дадзеную адмову законнай і абгрунтаванай і не ўгледзелі падставаў для яе адмены.

Сілавікі пагражалі выставіць абвінавачанне за «распаўсюд недакладных звестак» адной са сведкаў затрымання Віхора, якая сцвярджала, што сілавікі збівалі яго дубінкамі[128].

**Выснова**

Сілавікі жорстка збівалі Аляксандра Віхора ў памяшканні Чыгуначнага РАУС. Потым памясцілі ў цесны адсек у аўтазаку, з-за чаго ў яго пачалася паніка. Аднак замест надання медыцынскай дапамогі сілавікі працягвалі гвалтоўныя дзеянні ў дачыненні да Аляксандра Віхора: пырснулі газам у адсек з пярцовага балончыка, пакінулі ў аўтазаку і збівалі там да крытычнага стану, пасля чаго ён упаў у кому.

Такім чынам, дзяржавай былі дапушчаныя наступныя парушэнні міжнародных стандартаў і патрабаванняў заканадаўства, якія прывялі да смерці Аляксандра Віхора: адвольнае затрыманне, неправамернае ўжыванне сілы супрацоўнікамі міліцыі, ненаданне медыцынскай дапамогі, а таксама адмова ў правядзенні эфектыўнага расследавання. Матэрыяльную кампенсацыю сям'і пацярпелага не выплацілі.

## 2. Вітольд Ашурак

**Бэкграўнд:** 50 гадоў, жыў у г. Бярозаўка Лідскага раёна Гродненскай вобласці, быў палітычным і экалагічным актывістам — сябрам партыі БНФ, адным з каардынатараў руху «За Свабоду» і арганізатарам акцый пратэсту ў Лідскім раёне ў 2020 годзе.

121 https://spring96.org/ru/news/102625
122 https://web.archive.org/web/20201219012123/https://news.tut.by/society/696515.html
123 https://people.onliner.by/2020/12/12/kak-idut-proverki-po-delam-pogibshix-vo-vremya-protestov
124 CAT/C/BLR/6, п. 149;
125 https://belta.by/incident/view/usk-gomelchanin-aleksandr-vihor-umer-iz-za-vnezapno-obostrivshihsja-zabolevanij-428881-2021/, https://gp.by/novosti/obshchestvo/news230627.html
126 https://www.currenttime.tv/a/belarus-rally-vikhor/30815466.html
127 https://web.archive.org/web/20210105133004/https://news.tut.by/society/707317.html
128 https://www.belta.by/incident/view/usk-gomelchanin-aleksandr-vihor-umer-iz-za-vnezapno-obostrivshihsja-zabolevanij-428881-2021/

**Дата смерці:** 21 траўня 2021 г.

**Месца смерці:** папраўчая калонія №17 у г. Шклове Магілёўскай вобласці.

**Абставіны інцыдэнту**

Вітольд Ашурак быў затрыманы ў верасні 2020 года ў г. Ліда і 18 студзеня 2021 года асуджаны ў закрытым судзе да пяці гадоў пазбаўлення волі па абвінавачаннях у арганізацыі групавых дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак (артыкул 342 КК РБ), і гвалце ў дачыненні да супрацоўніка органаў унутраных спраў (артыкул 346 КК). Беларускія праваабаронцы прызналі дадзеныя абвінавачанні і прысуд палітычна матываванымі[129].

22 красавіка 2021 года, пасля адхілення апеляцыйнай скаргі на прысуд, Ашурак быў этапаваны ў папраўчую калонію №17 у Шклове Магілёўскай вобласці для адбыцця пакарання.

Увечары 21 траўня 2021 года прадстаўнік Следчага камітэта патэлефанаваў жонцы Ашурка і паведаміў ёй пра смерць мужа ў калоніі, меркавана ў выніку спынення сэрца. 25 траўня яго цела з забінтаванай галавой перадалі сваякам. Ім распавялі, што цела нібыта выпала з халадзільніка морга[130]. У папярэднім медыцынскім заключэнні, якое ім выдалі, у пункце «Афіцыйная прычына смерці» значылася «высвятляецца»[131].

У той жа дзень Упраўленне Следчага камітэта па Магілёўскай вобласці апублікавала відэа, змантаванае з некалькіх фрагментаў, на якім бачна, як мужчына ў робе зняволенага (меркавана, Вітольд) спачатку падае і ўдараецца галавой у камеры пры спробе схадзіць у прыбіральню, потым яму перавязваюць галаву, а пазней ён зноў падае[132].

Прадстаўнікі Следчага камітэта сцвярджалі, што Ашурак быў знойдзены ў камеры ў бессвядомым стане пасля другога падзення, для надання кваліфікаванай дапамогі яму былі выкліканыя супрацоўнікі медыцынскай часткі калоніі і хуткай медыцынскай дапамогі, але, нягледзячы на праведзеныя медыкамі рэанімацыйныя мерапрыемствы, ўратаваць мужчыну не атрымалася. Паводле словаў супрацоўнікаў калоніі, «асуджаны, разбіўшы галаву, скаргаў на стан здароўя не выказваў, адмовіўся ад дапамогі і шпіталізацыі»[133].

Сваякі і сябры Ашурка сцвярджаюць, што раней у яго не было праблемаў са здароўем. Калі яго апошні раз бачылі ў лютым-сакавіку 2021 года, перад этапам у калонію, ён таксама выглядаў цалкам здаровым і бадзёрым. Калі выдалі цела Вітольда, яно выглядала вельмі худым і змарнелым, было падобна, што ён страціў вагу не менш за 15-20 кг. Як стала вядома сваякам, пасля прыбыцця ў Шклоў Ашурак так і не быў прызначаны ў адзін з атрадаў калоніі — усе свае дні там ён правёў у ізаляцыі спачатку на каранціне, а потым у ШІЗА. Былыя зняволеныя, якія адбывалі пакаранне ў той жа калоніі, распавялі ў СМІ, што Вітольда там маглі збіваць і здзекавацца з яго[134].

У сваіх лістах блізкім са зняволення Ашурак пісаў, што вёў дзённік, але сярод яго асабістых рэчаў, перададзеных сваякам пасля яго смерці, гэтага дзённіка не было. Яны спадзяваліся, што дзённік зможа праліць нейкае святло на тое, што здарылася з Вітольдам у зняволенні, але іх спробы адшукаць яго не завершыліся поспехам, што можа сведчыць пра ўтойванне сілавікамі абставінаў катаванняў[135].

Праведзенае «Альянсам расследавальнікаў Беларусі» незалежнае расследаванне, апублікаванае ў студзені 2022 года, прыводзіць да высновы, што Вітольду Ашурку не была нададзеная належная медыцынская дапамога і адміністрацыя калоніі вінаватая ў прычыненні яму смерці па неасцярожнасці[136].

**Афіцыйная прычына смерці:** у пасведчанні пра смерць у пункце «прычына смерці» пазначаны код МКБ R99 («іншыя недакладна вызначаныя і неўдакладненыя прычыны смерці»).

**Меркавана вінаваты ў смерці (калі вядома):** кіраўнік ВК-17 Аляксандр Карніенка, кіраўнік рэжымнага аддзела ВК-17 Сяргей Карчэўскі, кіраўніца медчасткі ВК-17 Наталля Дабрадзеравец, псіхіятр-нарколаг ВК-17 Ігар Кандраценкаў, лекарка медыцынскай часткі ВК-17 Таццяна Развянкова, дзяжурны памочнік кіраўніка ВК-17 Дзяніс Сазонаў, суддзя Лідскага раённага суда

129 https://spring96.org/ru/news/101555, https://prisoners.spring96.org/ru/person/vitold-ashurak
130 https://www.bbc.com/russian/features-57642388
131 https://belsat.eu/ru/news/31-03-2022-prichiny-smerti-vitolda-ashurka-zaklyucheniya-nezavisimyh-ekspertov
132 https://www.youtube.com/watch?v=weCCKcNh3OU
133 https://sk.gov.by/ru/news-usk-mogilev-ru/view/sledovateli-ustanavlivajut-obstojatelstva-smerti-osuzhdennogo-v-kolonii-v-shklove-10022
134 https://svaboda.org/a/32145796.html, https://svaboda.org/a/32153349.html
135 https://belsat.eu/ru/news/31-03-2022-prichiny-smerti-vitolda-ashurka-zaklyucheniya-nezavisimyh-ekspertov
136 https://belsat.eu/ru/news/31-03-2022-prichiny-smerti-vitolda-ashurka-zaklyucheniya-nezavisimyh-ekspertov/

Максім Філатаў[137], сакратарка судовага паседжання (сакратарка суддзі Філатава) Папова Надзея Вітальеўна[138], следчы (праверка па факце смерці) Павел Старыкаў[139].

**Рэакцыя афіцыйных уладаў/расследаванне (стадыя)**

Брат Вітольда Андрэй Ашурак двойчы накіроўваў у Следчы камітэт запыты на азнаямленне з заключэннем судмедэкспертызы і іншымі матэрыяламі папярэдняй праверкі па факце яго смерці (у верасні і лістападзе 2021 года), але ў абодвух выпадках атрымаў адмовы: у першым выпадку — са спасылкай на тое, што не было завершанае правядзенне дадатковай судмедэкспертызы, прызначанай у межах праверкі[140], у другім — на тое, што брат не з'яўляецца законным прадстаўніком інтарэсаў памерлага[141]. На момант падрыхтоўкі дадзенага агляду, кастрычнік 2023 года, інфармацыя як пра афіцыйную прычыну смерці Ашурка, так і пра адкрыццё крымінальнай справы па гэтым факце па-ранейшаму адсутнічае.

Праверку па факце смерці Ашурка праводзіў старэйшы следчы Упраўлення Следчага камітэта па Магілёўскай вобласці маёр юстыцыі Павел Старыкаў.[142]

Андрэй Ашурак неаднаразова спрабаваў атрымаць хоць нейкую інфармацыю і вярнуць асабістыя рэчы брата. Следчы камітэт і Генеральная пракуратура праігнаравалі яго звароты.

У снежні 2021 года Андрэю Ашурку і сябру Вітольда Сяргею Пантусу стала вядома пра рызыку іх крымінальнага пераследу па справе пра «хуліганства» (за крыкі «Ганьба!» у зале суда пасля агалошвання прысуду Вітольду)[143], і яны былі вымушаныя тэрмінова з'ехаць з Беларусі.

**Выснова**

Супрацоўнікі калоніі №17 змясцілі ў ШІЗА знямоглага і аслабленага Вітольда Ашурка і мэтанакіравана каталі яго ўмовамі ўтрымання. Прычыну смерці і падзеі, якія папярэднічалі гэтаму, усталяваць зараз не ўяўляецца магчымым, тым не менш віна за смерць зняволенага цалкам кладзецца на кіраўніцтва і супрацоўнікаў калоніі, у чые абавязкі ўваходзіць гарантаванне бяспекі і аховы здароўя і жыцця зняволеных.

Следства па справе зацягваецца на ўсіх этапах і засакрэчваецца.

Такім чынам, дзяржавай былі дапушчаныя парушэнні міжнародных стандартаў утрымання і абыходжання са зняволенымі і парушэнні нацыянальных законаў, якія пасля прывялі да смерці Вітольда Ашурка: адвольнае затрыманне, адсутнасць справядлівага суда, катаванні, ненаданне медыцынскай дапамогі, а таксама адмова ў правядзенні эфектыўнага расследавання і выплаце кампенсацыі сям'і загінулага ў зняволенні.

## 3. Дзмітрый Дудойць

**Бэкграўнд:** 43 гады, жыў у г. Смаргонь; быў асуджаны да двух гадоў «хіміі» па артыкуле за абразу прадстаўніка ўладаў за каментар у сацсетцы «Аднакласнікі», у якім, паводле матэрыялаў следства, яшчэ да выбараў «з дапамогай ненарматыўнай лексікі ахарактарызаваў кіраўніка Ганцавіцкага РАУС Віталя Куляшова, падпісаўшы яго фота: «скаціна лысая, хутка прыйдзе наш час...»»[144]; з 29 снежня 2021 г. адбываў тэрмін у папраўчай установе адкрытага тыпу № 43[145].

**Дата смерці:** 5 студзеня 2022 г.

**Месца смерці:** г. Магілёў, вул. Чалюскінцаў.

**Абставіны інцыдэнту**

У дзень інцыдэнту асуджаных вадзілі ў паліклініку на прафагляд. Вяртаючыся з паліклінікі, Дзмітрый Дудойць збег ад суправаджэння. Каля 11 гадзінаў дня магіляўчане заўважылі на дарозе пад мастом чалавека, які ляжаў[146]. Дзмітрый скочыў з моста на праезную частку і разбіўся[147].

137 https://prisoners.spring96.org/ru/person/vitold-ashurak
138 https://be-tarask.wikipedia.org/wiki/Лідзкі_РАУС#cite_note-5
139 https://www.svaboda.org/a/31860041.html
140 https://web.archive.org/web/20211023075715/https:/naviny.online/new/20211021/1634832093-sk-provodit-dopolnitelnuyu-sudmedekspertizu-prichin-smerti-vitolda-ashurka
141 https://spring96.org/ru/news/107754
142 https://t.me/allians_belarus/13
143 https://belsat.eu/ru/news/16-12-2021-prokuratura-vozbudila-ugolovnoe-delo-za-skandirovanie-pozor-posle-prigovora-vitoldu-ashurku
144 https://nashaniva.com/?c=ar&i=282654&lang=ru&ysclid=lk9mwf978y147447312
145 https://t.me/viasna96/8810
146 https://motolko.help/ru-news/zaklyuchyonnyj-dmitrij-dudojt-sovershil-suiczid-v-mogilyove/
147 https://t.me/zamkadomby/11433

Паводле расповедаў блізкіх сяброў[148], адбываць «хімію» мужчына ехаў з траўмай — 3 верасня ён парваў звязку на левым каленным суставе. Перад судом блізкія збіралі ўсе даведкі, спрабавалі даказаць, што Дзмітрый перасоўваецца з мыліцамі і не можа выконваць фізічную працу. Суд не прыняў пад увагу стан здароўя Дзмітрыя.

Псіхалагічны стан асуджанага таксама быў цяжкі. Ад'езд з дому і расстанне з блізкімі людзьмі ён пераносіў цяжка. Ужо знаходзячыся на «хіміі», ён казаў, што яму вельмі дрэнна. Адносіны з людзьмі ў ВУАТ у яго не складваліся — мужчына казаў сябрам, што [яго атачае] «сто чалавек, і ніхто не вітаецца». Верагодна, іншым асуджаным сілавікі ўстановы забаранялі размаўляць з Дзмітрыем.

**Афіцыйная прычына смерці:** суіцыд.

**Меркавана вінаваты ў смерці (калі вядома):** кіраўнік магілёўскай папраўчай установы адкрытага тыпу № 43 Таранька Сяргей Юр'евіч, суддзя — Балондзь Сяргей[149].

**Рэакцыя афіцыйных уладаў/расследаванне (стадыя)**

Следчы камітэт адзначае[150], што Дудойць (яго прозвішча ў паведамленні не называецца) прыбыў у Магілёў у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу для адбыцця пакарання 29 снежня 2021 года. Зранку ў сераду ў суправаджэнні супрацоўніка адміністрацыі група асуджаных наведвала паліклініку для праходжання прафагляду. Сцвярджаецца, што палітзняволены «пазней… самастойна сышоў» адтуль у бок вуліцы Чалюскінцаў, дзе і саскочыў з моста на праезную частку, атрымаў смяротную траўму. Пра здарэнне праваахоўнікам паведамілі сведкі[151].

Следчы камітэт праводзіў следчыя дзеянні, былі апытаныя сведкі, прызначаныя экспертызы. Апублікаванае відэа смерці Дудойця[152].

**Выснова**

Першапачаткова суддзя Сяргей Балондзь асудзіў Дзмітрыя Дудойця да пакарання, не ўлічваючы яго фізічнага стану здароўя, нягледзячы на наяўнасць адпаведных медыцынскіх дакументаў. Супрацоўнікі папраўчай установы стварылі для палітычнага зняволенага невыносна цяжкія ўмовы ва ўстанове, моцна на яго ціснулі псіхалагічна, у тым ліку праз іншых зняволеных, што адзначаў сам Дзмітрый. Псіхалагічную дапамогу і дапамогу ў адаптацыі ва ўмовах зняволення ён не атрымаў. Падобнае стаўленне сілавікоў папраўчай установы можна аднесці да складу злачынства па артыкуле 145 КК РБ («Давядзенне да самагубства»).

Такім чынам, дзяржава не зрабіла мераў для захавання жыцця Дзмітрыя Дудойця, не стварыла прымальных умоваў адбыцця пакарання, у тым ліку шляхам арганізацыі псіхалагічнай дапамогі і медыцынскага абслугоўвання, чым парушыла міжнародныя стандарты абыходжання са зняволенымі. Не было праведзенае эфектыўнае расследаванне па факце смерці. Матэрыяльную кампенсацыю сям'я загінулага не атрымала.

## 4. Алена Амеліна

**Бэкграўнд:** 53 гады, жыла ў г. Мінску; у красавіку 2021 г. была ўпершыню асуджаная і адбывала адміністратыўны арышт за аўтапрабег з бела-чырвона-белымі сцягамі, другі раз была затрыманая ў пачатку верасня 2021 г. і асуджаная на 15 сутак адміністратыўнага арышту за рэпост матэрыялу з «экстрэмісцкай» крыніцы.

**Дата смерці:** кастрычнік 2021 г.

**Месца смерці:** клінічная бальніца г. Мінска

**Абставіны інцыдэнту**

Жыхарка Мінска Алена Амеліна памерла ва ўзросце 53 гадоў (1968 г.н.) ад наступстваў каранавіруснай інфекцыі[153]. Заразілася яна ў ізалятары на Акрэсціна, дзе ў верасні 2021 года адбывала адміністратыўны арышт.

Умовы знаходжання ў камеры на Акрэсціна былі вельмі цяжкія: камера перапоўненая, жанчыны

148 https://news.zerkalo.io/life/8192.html
149 https://prisoners.spring96.org/ru/person/dzmitryi-dudoic
150 https://t.me/skgovby/6212
151 https://euroradio.fm/ru/sledstvennyy-komitet-o-samoubiystve-politzaklyuchennogo-v-mogileve
152 https://euroradio.fm/ru/sledstvennyy-komitet-o-samoubiystve-politzaklyuchennogo-v-mogileve?ysclid=lk9n3hussy505463813
153 https://belsat.eu/ru/news/13-10-2021-chi-smerti-v-2021-godu-svyazany-s-politikoj-gosudarstvennogo-terrora-v-belarusi

былі вымушаныя спаць нават на падлозе, было вельмі халодна. Сукамерніцы Алены распавядалі, што ў іх камеры хварэлі практычна ўсе. Алена пераносіла інфекцыю вельмі цяжка, практычна не ела і не ўставала[154]. Медыцынская дапамога тым, хто хварэў у камеры, у належнай меры не надавалася, Алене «...толькі зрэдку давалі фурацылін, парацэтамол, а калі было зусім дрэнна — нейкія антыбіётыкі»[155].

Адбыўшы 15-суткавы арышт і вярнуўшыся дадому, Алена Амеліна трапіла ў бальніцу, дзе яе адразу ж змясцілі на ШВЛ. Яна ўпала ў кому. Лекары больш за два тыдні беспаспяхова змагаліся за яе жыццё.

**Афіцыйная прычына смерці:** наступствы каранавіруснай інфекцыі.

**Меркавана вінаваты ў смерці (калі вядома):** кіраўнік ЦІП на Акрэсціна Яўген Шапецька.

**Рэакцыя афіцыйных уладаў/расследаванне (стадыя):** невядома.

**Выснова**

Усе незалежныя СМІ ў Беларусі былі прызнаныя рэжымам экстрэмісцкімі, што дае магчымасць пераследаваць грамадзянаў за падпіскі на незалежныя СМІ і рэпосты з іх.

Мэтанакіраванае пагаршэнне ўмоваў утрымання адміністратыўна арыштаваным адбылося па ўказанні кіраўніцтва МУС пасля 8 кастрычніка 2020 года. Менавіта тады «палітычных» пачалі зноў садзіць у перапоўненыя ў 4-8 разоў камеры, адчыняць вокны ў камерах, калі на вуліцы ўжо было халодна, забіраць пасцельныя прыналежнасці, не выдаваць сродкі гігіены і забараняць ляжаць на ложках удзень. Усё гэта прыводзіла да выбухаў COVID-19 сярод адміністратыўна арыштаваных.

Належнай медыцынскай дапамогі людзям не надавалася, многім хворым, нават з высокай тэмпературай, не дазвалялася класціся на ложкі ўдзень. У інтэрв’ю СМІ баскетбалістка Алена Леўчанка, якая адбывала адміністратыўны арышт па палітычным артыкуле з 30 верасня 2020 года, заявіла, што Яўген Шапецька пацвярджаў мэтанакіраванае пагаршэнне ўмоваў утрымання: «Тут за ўмовы вашага ўтрымання адказваю я. Гэта робіцца для таго, каб вам не хацелася сюды вярнуцца»[156].

Праз гэтыя мэтанакіраваныя дзеянні па стварэнні жорсткіх і бесчалавечных умоваў утрымання, якія нясуць небяспеку для здароўю і жыцця, захварэла і памерла Алена Амеліна.

Такім чынам, дзяржавай былі дапушчаныя наступныя парушэнні, якія пасля прывялі да смерці Алены Амелінай: адвольнае затрыманне, адсутнасць справядлівага суда, неналежныя санітарна-эпідэміялагічныя ўмовы ўтрымання затрыманых, парушэнне стандартаў па абыходжанні з асобамі, якія знаходзяцца ў месцах няволі, у тым ліку стандартаў па наданні медыцынскай дапамогі такім асобам, адмова ў правядзенні эфектыўнага расследавання.

## 5. Сяргей Шчацінка

**Бэкграўнд:** 57 гадоў, жыў у г. Асіповічы, быў затрыманы 12 лістапада 2020 г. і асуджаны на 10 сутак адміністратыўнага арышту за ўдзел у несанкцыянаваным мерапрыемстве[157].

**Дата смерці:** 11 снежня 2020 г.

**Месца смерці:** г. Асіповічы.

**Абставіны інцыдэнту**

Упершыню міліцыя затрымала Сяргея і яго жонку Алу ў кастрычніку — яны атрымалі вуснае папярэджанне. 12 лістапада 2020 года муж і жонка Шчацінка праводзілі палітычны флэшмоб і фатаграфаваліся, за што іх зноў затрымалі. Суд даў Сяргею 10 сутак арышту, яго змясцілі ў Асіповіцкі ІЧУ. Мужчына выйшаў на волю 22 лістапада.

Падчас адбыцця арышту да яго ў камеру падсялілі чалавека з высокай тэмпературай. Сімптомы захворвання Сяргей адчуў ужо пры вызваленні.

Пасля адбыцця арышту здароўе Сяргея значна пагоршылася, яму неаднаразова выклікалі хуткую дапамогу. У паліклініцы зрабілі тэст і COVID-19 пацвердзіўся. Мужчына хварэў дома два тыдні, у

154 https://d3rebrwga7u6ai.cloudfront.net/?c=ar&i=279124
155 https://reform.by/266439-umerla-minchanka-zabolevshaja-kovidom-na-okrestina
156 https://meduza.io/feature/2020/10/29/sdelali-iz-hleba-figurki-dlya-shashek-i-igrali
157 https://belsat.eu/news/29-09-2021-pamyor-yashche-adzin-vyazen-yaki-zaraziusya-karonavirusam-na-akrestsina

яго была высокая тэмпература і ён моцна кашляў. За тры дні да закрыцця бальнічнага ён памёр[158].

**Афіцыйная прычына смерці:** наступствы каранавіруснай інфекцыі.

**Меркавана вінаваты ў смерці (калі вядома):** кіраўнік ІЧУ Асіповіцкага РАУС Аляксандр Анікееў[159].

**Рэакцыя афіцыйных уладаў/расследаванне (стадыя):** невядома.

**Выснова**

Мэтанакіраванае пагаршэнне ўмоваў утрымання па ўказанні кіраўніцтва МУС пасля 8 кастрычніка 2020 года прывяло да выбуху COVID-19 сярод адміністратыўна арыштаваных. Належнай медыцынскай дапамогі людзям не надавалася. Праз дзеянні супрацоўнікаў ІЧУ па стварэнні жорсткіх і бесчалавечных умоваў утрымання, якія нясуць небяспеку для здароўя і жыцця, захварэў і памёр Сяргей Шчацінка.

Такім чынам, дзяржавай былі дапушчаныя наступныя парушэнні, якія пасля прывялі да смерці Сяргея Шчацінкі: адвольнае затрыманне, адсутнасць справядлівага суда, неналежныя санітарна-эпідэміялагічныя ўмовы ўтрымання затрыманых, парушэнне стандартаў па абыходжанні з асобамі, якія знаходзяцца ў месцах няволі, у тым ліку стандартаў па наданні медыцынскай дапамогі такім асобам, адмова ў правядзенні эфектыўнага расследавання.

## 6. Мікалай Клімовіч

**Бэкграўнд:** 61 год, жыў у г. Пінску, быў актывістам і блогерам, меў інваліднасць II групы з-за захворвання сэрцава-судзіннай сістэмы, перанёс інсульт і складаную аперацыю на сэрцы; у снежні 2022 г. быў затрыманы і ў лютым 2023 г. асуджаны па артыкуле за абразу прэзідэнта за карыкатуру на Лукашэнку ў сацыяльных сетках[160].

**Дата смерці:** 5 траўня 2023 г.

**Месца смерці:** ВК №3 «Віцьба» ў Віцебскай вобласці.

**Абставіны інцыдэнту**

Нягледзячы на захворванне ў Мікалая Клімовіча і пры наяўнасці альтэрнатыўных відаў пакарання, не звязаных з пазбаўленнем волі, суддзя Пінскага раёна і горада Пінска Андрэй Бычыла прызначыў цяжка хвораму чалавеку пакаранне ў выглядзе аднаго года пазбаўлення волі, а Брэсцкі абласны суд пакінуў у сіле прысуд суда першай інстанцыі. Дзяржабвінаваўцам у дадзеным працэсе быў пракурор Ілля Гузарэвіч[161].

Да разгляду апеляцыйнай скаргі Мікалай утрымліваўся два месяцы ў СІЗА № 6 г. Баранавічы. Пакаранне адбываў у папраўчай калоніі № 3 «Віцьба», дзе прабыў два тыдні.

Сам Мікалай, яго родныя і адвакат, неаднаразова выказвалі занепакоенасць станам яго здароўя. З-за свайго дыягназу ён павінен быў знаходзіцца пад пастаянным назіраннем лекара-кардыёлага і прымаць неабходныя лекі. Мікалай Клімовіч сканаў ва ўзросце 61 года[162].

**Афіцыйная прычына смерці:** стан здароўя.

**Меркавана вінаваты ў смерці (калі вядома):** суддзя Пінскага раёна Андрэй Бычыла, памочнік пінскага міжраённага пракурора Ілля Гузарэвіч, кіраўнік ВК №3 «Віцьба» Аляксей Старавойтаў, кіраўнік медсанчасткі В.Я. Раманаў[163].

**Рэакцыя афіцыйных уладаў/расследаванне (стадыя):** сваякам паведамілі пра праведзеную праверку па факце смерці ў калоніі[164], вінаватых у смерці не выяўлена.

**Высновы**

Суддзя, ведаючы пра захворванні і II групу інваліднасці ў Мікалая Клімовіча, прызначыў пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі пры наяўнасці альтэрнатыўных відаў пакарання. Гэта прывяло да ўскладненняў са здароўем у Мікалая ў ВК-3. Службовыя асобы ВК-3 не далі своечасовай

158 https://people.onliner.by/2020/12/18/muzhchina-otsidel-v-ivs-i-zarazilsya-koronavirusom
159 https://osipovichi-region.by/osipovichi/2020/04/odno-iz-samyh-zakrytyh-podrazdelenij-miliczii-ivs/
160 https://prisoners.spring96.org/ru/person/mikalai-klimovicz
161 https://spring96.org/ru/news/111634
162 https://spring96.org/ru/news/111644
163 https://vk.com/club69844158?z=photo-69844158_457239068%2Fwall-69844158_1381
164 https://www.racyja.com/hramadstva/zavyarshylasya-praverka-pa-faktse-smertsi/

медыцынскай дапамогі Мікалаю, што прывяло да яго смерці.

Такім чынам, дзяржавай былі дапушчаныя наступныя парушэнні, якія пасля прывялі да смерці Мікалая Клімовіча: адвольнае затрыманне, адсутнасць справядлівага суда, несувымернае і негуманнае пакаранне, якое не ўлічвае стан здароўя Мікалая, катаванні і парушэнне міжнародных стандартаў у дачыненні да людзей, якія знаходзіліся ў месцах няволі, ненаданне медыцынскай дапамогі. Эфектыўнага расследавання факта смерці не праведзена. Матэрыяльная кампенсацыя сям'і не выплачаная.

## 7. Алесь Пушкін

**Бэкграўнд:** 57 гадоў, жыў у мястэчку Бобр у Мінскай вобласці, вядомы беларускі мастак-нонканфарміст і перформер, за гады сваёй дзейнасці шматразова пераследаваўся па палітычных матывах, быў удзельнікам пратэстных акцый 2020 г. і прынцыпова вярнуўся ў Беларусь, калі на яго завялі крымінальную справу; 30 сакавіка 2022 г. у закрытым судовым працэсе быў асуджаны да 5 гадоў зняволення ва ўмовах строгага рэжыму за «здзек з дзяржаўных сімвалаў» і «распальванне сацыяльнай варожасці».

**Дата смерці:** 11 ліпеня 2023 г.

**Месца смерці:** бальніца хуткай медыцынскай дапамогі г. Гродна (турма №1 г. Гродна).

**Абставіны інцыдэнту**

Першапачаткова Алесь адбываў пакаранне ў папраўчай калоніі №22 у Івацэвіцкім раёне («Воўчыя норы»). Пазней адміністрацыя гэтай установы пакарала яго пяццю месяцамі зняволення ў ПКТ[165].

22 лістапада 2022 года Алеся Пушкіна перавялі ў гродненскую турму №1 на строгі рэжым, Алесь адбыў там шэсць месяцаў. За гэты час ён пахудзеў на 20 кілаграмаў, скардзіўся родным на боль у нырках[166]. У турме ў яго адкрылася прабадная язва, аднак своечасовую медыцынскую дапамогу ён не атрымаў. Некалькі дзён яму давалі толькі абязбольвальнікі.

10 ліпеня каля 11 раніцы палітзняволенага ўжо ў бессвядомым стане, практычна пры смерці, прывезлі ў бальніцу, дзе ён быў прааперыраваны. У яго быў перытаніт, сепсіс, паліорганавая недастатковасць і нават пашкоджаная дыяфрагма. Гэта кажа пра тое, што востры перыяд захворвання працягваўся, хутчэй за ўсё, некалькі сутак[167]. Прычынай прабадной язвы магло стаць турэмнае харчаванне і адсутнасць неабходных медыкаментаў[168].

У ноч з 10 на 11 ліпеня ён памёр у рэанімацыі. Алесю Пушкіну было 57 гадоў.

**Афіцыйная прычына смерці:** у пратаколе ўскрыцця напісана, што прычына смерці невядомая[169].

**Меркавана вінаваты ў смерці (калі вядома)[170]:** кіраўнік турмы №1 г. Гродна Павел Казакоў, кіраўнік медчасткі турмы №1 г. Гродна Віктар Лутцаў, суддзя Алена Шылько[171], пракурор Аляксандр Кароль.

**Рэакцыя афіцыйных уладаў/расследаванне (стадыя):** невядома.

**Выснова**

Умовы ўтрымання і прадузятае стаўленне да Алеся Пушкіна як да палітычнага зняволенага ў папраўчай калоніі №22, а потым і ў гродненскай турме №1 прывялі да сур'ёзных праблемаў са здароўем.

Падчас знаходжання ў турме №1 ён страціў вагу каля 20 кг. Прычынаў такой рэзкай страты вагі медсупрацоўнікі не высвятлялі. Такім чынам, з-за няякаснай ежы і жорсткіх умоваў утрымання ў Алеся Пушкіна здарылася прабадная язва, ён адчуваў страшны боль, аднак турэмны медперсанал бяздзейнічаў і кваліфікаванай медыцынскай дапамогі яму не надаваў. У крытычным стане без свядомасці ён быў дастаўлены ў грамадзянскую бальніцу, дзе лекары не змаглі яго ўратаваць.

Дзяржавай былі дапушчаныя парушэнні міжнародных стандартаў і нацыянальных нормаў, якія пасля прывялі да смерці Алеся Пушкіна: адвольнае затрыманне, адсутнасць справядлівага суда,

165 https://nashaniva.com/321392?lang=ru
166 https://spring96.org/ru/news/112175
167 https://news.zerkalo.io/life/43584.html?c
168 https://news.zerkalo.io/life/44591.html?c
169 https://www.svaboda.org/a/32500527.html
170 https://nashaniva.com/ru/321642
171 https://spring96.org/ru/news/107231

катаванні і жорсткае абыходжанне, ненаданне медыцынскай дапамогі. Дзяржава не правяла эфектыўнага расследавання факта смерці. Матэрыяльная кампенсацыя сям'і пацярпелага не выплачаная.

## 8. Дзмітрый Сарокін

**Бэкграўнд:** 37 гадоў, жыў у г. Ліда, паэт і ўдзельнік фестываляў сучаснага мастацтва[172]; паводле расповедаў знаёмых Дзмітрыя, сілавікі затрымлівалі яго раней і здымалі з ім відэа-«каянне»; інфармацыя пра прычыны затрымання супярэчлівая: адзін са знаёмых сцвярджае, што апошняе затрыманне «не было звязанае з палітыкай, былі бытавыя прычыны» і памёр Дзмітрый з-за праблемаў з сэрцам[173], а іншы яго знаёмы лічыць, што стан здароўя не мог быць прычынай смерці.

**Дата смерці:** 1 чэрвеня 2023 г.

**Месца смерці:** Лідскі РАУС.

**Абставіны інцыдэнту**

Ніякай інфармацыі пра прычыны смерці, затрымання і дастаўкі ў РАУС не маецца. Дзяжурны Лідскага РАУС пацвердзіў факт смерці Дзмітрыя Сарокіна ў РАУС[174].

**Афіцыйная прычына смерці:** невядома.

**Меркавана вінаваты ў смерці (калі вядома):** кіраўнік Лідскага РАУС Сяргей Сыцэвіч.

**Рэакцыя афіцыйных уладаў/расследаванне (стадыя):** невядома.

**Высновы**

Дзмітрый Сарокін памёр, знаходзячыся непасрэдна ў сценах Лідскага РАУС, што дазваляе сцвярджаць, што дзяржавай былі дапушчаныя наступныя парушэнні, якія пасля прывялі да яго смерці: парушэнне стандартаў па абыходжанні з затрыманымі, у тым ліку стандартаў па наданні медыцынскай дапамогі затрыманым, а таксама адмова ў правядзенні эфектыўнага расследавання.

---

172 https://belsat.eu/ru/news/05-06-2023-byl-molod-i-bodr-pravozashhitnik-nazval-dosadnoj-smert-poeta-v-lidskom-rovd-kak-prykraj
173 https://www.svaboda.org/a/32445519.html
174 https://news.zerkalo.io/accidents/40704.html

# Высновы

Палітычныя рэпрэсіі ў Беларусі, якія рэзка ўзмацніліся пасля сфальсіфікаваных выбараў прэзідэнта 9 жніўня 2020 года і не спыняюцца да цяперашняга часу, прывялі да прававога дэфолту і зрабілі існаванне дэмакратыі немагчымым.

З поўнай упэўненасцю праз тры гады пасля выбараў можна сцвярджаць, што ў грамадстве адбылася рэзкая палітычная палярызацыя, з-за масавых рэпрэсій і злачынстваў супраць чалавечнасці, якія здзяйсняюцца і да сёння, канчаткова разбураны давер да кіраўніцтва краіны і дзяржаўных інстытутаў.

Дзяржава не выконвае функцыі па абароне правоў чалавека, якія на яе ўскладзеныя міжнароднымі абавязаннямі, Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь і нормамі нацыянальнага права. Так, дзяржава не выконвае свае абавязанні па забеспячэнні аховы жыцця і здароўя сваіх грамадзянаў, у тым ліку асобаў, якія пазбаўленыя волі і знаходзяцца ў ізаляцыі.

Найвышэйшай ступенню грэбавання правамі чалавека з'яўляецца фактычная адмова ад абароны жыцця і здароўя сваіх грамадзянаў, а таксама непасрэднае беспакаранае і беспадстаўнае забойства грамадзянаў супрацоўнікамі дзяржаўных сілавых структураў.

Выпадкі катаванняў, збіцця, жорсткага абыходжання, ненадання ці несвоечасовага/неналежнага надання медыцынскай дапамогі палітычным зняволеным ці затрыманым маюць шырокі распаўсюд, і ў некаторых выпадках гэта з'яўляецца прамой прычынай смерці зняволеных.

Усе вышэйпералічаныя дзеянні адбываюцца з маўклівага ўхвалення кіраўніцтва і вышэйшых службовых асобаў рэжыму.

Доступ да месцаў пазбаўлення волі з мэтай грамадзянскага кантролю і маніторынгу ўмоваў утрымання ў грамадзянскай супольнасці, праваабарончых арганізацый адсутнічае[175].

Сыходзячы з прыведзенай у аглядзе інфармацыі, дадзеных, атрыманых ад сваякоў і сяброў грамадзянаў, якія загінулі пасля 2020 года па палітычных матывах, аўтары публікуюць наступныя высновы датычна да смерцяў у Беларусі, якія адбыліся праз віну рэжыму.

1. Рэжым не зрабіў захадаў для абароны права на жыццё грамадзянаў, азначаных у дадзеным аглядзе, а яго дзеянні належаць ацэнцы з пункту гледжання прымяняльнага міжнароднага крымінальнага права.

2. Рэжым не праводзіць эфектыўнага афіцыйнага расследавання выпадкаў смерцяў грамадзянаў у месцах пазбаўлення волі або дзеянняў, зробленых супрацоўнікамі сілавых структураў, якія прывялі да смерці грамадзянаў, не забяспечвае прыцягнення да адказнасці вінаватых, не ліквідуе прычыны парушэння права на жыццё, што прыводзіць да беспакаранасці злачынцаў і паўтарэння злачынстваў супраць жыцця і здароўя грамадзянаў.

3. Рэжым не ў поўнай меры расследуе ўсе патэнцыйна незаконныя смерці, якія надышлі ў выніку дзеянняў прыватных асобаў, што таксама з'яўляецца парушэннем права на жыццё з боку дзяржавы, хаця яна і не можа прадухіліць такія смерці.

4. Сілавымі органамі краіны парушаныя міжнародныя стандарты і нормы закона пра неабходнасць і сувымернасць ужывання сілы і агнявой зброі падчас прыгнячэння мірных пратэстаў у 2020 годзе.

5. Судовая сістэма рэжыму настроеная на жорсткае пакаранне грамадзяніна, які абвінавачваецца ў злачынстве па палітычных матывах, не ўлічвае яго стан здароўя і не выкарыстоўвае альтэрнатыўныя меры пакарання, не ўжывае вызваленне ад пакарання цяжкахворых або людзей з інваліднасцю, што вядзе да выкарыстання крымінальнай адказнасці як пакарання за нязгоду з дзейнай уладай і парушэння права на жыццё грамадзянаў пад пераследам.

6. Рэжым дэзінфармуе грамадства пра сапраўднае становішча і стан здароўя зняволеных і прычыны смерцяў у месцах пазбаўлення волі. Палітычныя зняволеныя, якія знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі, у шэрагу выпадкаў знаходзяцца ў стане інкамунікада (поўная ізаляцыя ад кантактаў з роднымі, адвакатамі, забарона званкоў, спатканняў, перапіскі), што з'яўляецца адным з сігналаў пра катаванні і жорсткае абыходжанне.

175 Трэба ўлічваць, што ўсе праваабарончыя арганізацыі пазбаўленыя рэгістрацыі ў Беларусі, а іх чальцы вымушаныя былі пакінуць Беларусь з-за пераследу рэжымам.

7. Рэжым не робіць мераў па ўдасканаленні сістэмы надання медыцынскай і псіхалагічнай дапамогі ў пенітэцыярных установах краіны на працягу многіх гадоў, не абсталёўвае медсанчасткі сучасным медыцынскім абсталяваннем, не забяспечвае хворых жыццёва неабходнымі лекавымі прэпаратамі. Усё гэта прыводзіць да сур'ёзнага пагаршэння здароўя асобаў, якія адбываюць пакаранне, што ўплывае на іх якасць жыцця і пасля адбыцця пакарання. Самым сур'ёзным наступствам невыканання дзяржавай сваіх абавязанняў з'яўляюцца смерці зняволеных з прычыны ненадання або несвоечасовага/неэфектыўнага надання медыцынскай дапамогі, і колькасць такіх смерцяў у месцах несвабоды няўхільна ўзрастае.

8. Рэжым не праводзіць навучанне або павышэнне кваліфікацыі супрацоўнікаў пенітэцыярнай сістэмы, што неабходна ў адпаведнасці з патрабаваннямі міжнародных стандартаў па абыходжанні са зняволенымі.

Такім чынам, рэжым дае недастатковую прававую ахову права на жыццё, дапускае і заахвочвае адвольнае ўжыванне смяротнай зброі сілавымі структурамі, неналежна і/або недастаткова надае медыцынскую і псіхалагічную дапамогу ў месцах няволі, запалохвае падазраваных (абвінавачаных) пры правядзенні следчых дзеянняў, уводзіць у стан страху і роспачы апазіцыйна настроеных грамадзянаў, што ў некаторых выпадках прыводзіць да суіцыдаў, а таксама не ажыццяўляе належнае расследаванне выпадкаў пазбаўлення жыцця.

Усе вышэйназваныя дзеянні ці бяздзеянне рэжыму з'яўляюцца парушэннем не толькі права чалавека на жыццё, але і парушэннем іншых міжнародных абавязанняў у адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі.

Нароўні з названымі ў дадзенай справаздачы вінаватымі ў злачынствах супраць жыцця і адказнымі за выпадкі смерцяў, якія надышлі ў выніку палітычнага пераследу або пакарання, лічым службовых асобаў рэжыму, якія пералічаныя далей.

**1. Аляксандр Лукашэнка**, нелегітымны прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, асоба, якая экспрапрыявала ўладу ў краіне. Дзеянні, якія ставяцца ў віну: пазбаўленне грамадзянаў неад'емных правоў па дыскрымінацыйных матывах, а менавіта ў сілу іх палітычных поглядаў і перакананняў, арганізацыя і заахвочванне сістэмы рэпрэсій супраць іншадумцаў, арганізацыя і ўдзел у злачынствах супраць чалавечнасці.

**2. Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь:** міністр Юрый Караеў (з 11.06.2019 г. па 29.10.2020 г.), міністр Іван Кубракоў (з 29.10.2020 г.) — катаванні і жорсткае абыходжанне ў месцах, якія ажыццяўляюць прымусовую ізаляцыю, і ў месцах затрымання (ІЧУ, ЦІП, СІЗА, РУУС і інш.), невыкананне абавязанняў па забеспячэнні аховы жыцця і здароўя асобаў, якія пазбаўленыя волі і знаходзяцца ў ізаляцыі. Сілавікі ўсіх узроўняў, якія ўдзельнічаюць у забойствах, катаваннях і пераследзе грамадзянаў па палітычных матывах.

**3. Дэпартамент выканання пакаранняў МУС Рэспублікі Беларусь:** Кіраўнік Алег Маткін — катаванні і жорсткае абыходжанне ў месцах пазбаўлення волі (папраўчыя ўстановы і турмы), стварэнне ўтрымання інкамунікада для палітычных зняволеных, невыкананне абавязанняў па забеспячэнні аховы жыцця і здароўя асобаў, якія пазбаўленыя волі і знаходзяцца ў ізаляцыі. Кіраўнікі папраўчых установаў, кіраўнікі медчастак — стварэнне жорсткіх бесчалавечных умоваў утрымання, псіхалагічны ціск на палітзняволеных, ненаданне эфектыўнай медыцынскай дапамогі, стварэнне ўтрымання інкамунікада для палітычных зняволеных.

**4. Камітэт дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь:** старшыня Іван Церцель (з 03.09.2020 г.) — арганізацыя і правядзенне сістэмы татальнага кантролю і рэпрэсій, прамое ўказанне на ўжыванне агнявой зброі пры арганізацыі мерапрыемстваў супраць іншадумцаў, катаванні і жорсткае абыходжанне.

**5. Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь:** міністр Віктар Хрэнін (з 20.01.2020 г.) — прамое ўказанне на ўжыванне агнявой зброі і несувымернай сілы пры разгоне мірных пратэстаў у дачыненні да іншадумцаў у 2020 годзе. Вышэйшае кіраўніцтва МА, кіраўніцтва ваенных структураў, якія ўдзельнічаюць у жорсткіх разгонах мірных дэманстрантаў з ужываннем агнявой і траўматычнай зброі.

**6. Следчы камітэт Рэспублікі Беларусь:** старшыня Іван Наскевіч (з 10.11.2015 г. па 11.03.2021 г.), старшыня Дзмітрый Гара (з 11.03.2021 г.) — адмова ў завядзенні крымінальных спраў па фактах катаванняў і забойстваў грамадзянаў-удзельнікаў мірных пратэстаў, адмова ў расследаваннні фактаў смерцяў у месцах пазбаўлення волі. Следчыя ўсіх узроўняў, якія ўдзельнічаюць у

пераследах грамадзянаў па палітычных матывах і не ажыццяўляюць належнае расследаванне па заявах грамадзянаў пра катаванні і жорсткае абыходжанне, перавышэнне службовымі асобамі паўнамоцтваў, пра смерці праз віну дзяржавы.

**7. Пракуратура Рэспублікі Беларусь:** Генеральны пракурор Аляксандр Канюк (з 22.04.2013 г. па 09.09.2020 г.), Генеральны пракурор Андрэй Швед (з 09.09.2020 года) — невыкарыстанне мераў пракурорскага рэагавання па спыненні відавочна непрапарцыйных дзеянняў супрацоўнікаў міліцыі, неажыццяўленне аб'ектыўнага і бесстаронняга нагляду за дзеяннямі следчых па разглядзе заяваў пра катаванні, расследаванні забойстваў мірных дэманстрантаў, неажыццяўленне эфектыўнага расследавання па фактах забойстваў і смерцяў па палітычных матывах, пераслед грамадзянаў па палітычных матывах, падтрыманне ў судзе абвінавачанняў па палітычна матываваных справах і патрабаванне пра прызначэнне непрапарцыйна жорсткіх пакаранняў. Пракуроры ўсіх узроўняў, якія ўдзельнічаюць у пераследах грамадзянаў па палітычных матывах.

**8. Вярхоўны суд Рэспублікі Беларусь:** старшыня Валянцін Сукала (з 1997 г.), старшыні ўсіх судоў агульнай юрысдыкцыі і суддзі, якія выносілі прысуды і пастановы па палітычна матываваных справах — вынясенне свядома неправасудных прысудаў, прызначэнне суворых пакаранняў, якія не ўлічваюць стан здароўя асуджаных, ігнараванне яўных фальсіфікацый спраў, што дапускаюцца сілавікамі і следчымі органамі.